Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛІСТАПАДА 2014 г. ЧАЦВЕР № 212 (27822) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АД ГІСТОРЫІ НЕ АДМОВІМСЯ



*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас з гістарычным святам — Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.*

*Несумненна, падзеі кастрычніка 1917 года змянілі лёс вялікай краіны і стварылі ўмовы для нацыянальнага адраджэння народаў, якія яе насялялі, а таксама для рэалізацыі права нацый на самавызначэнне.*

*Гераічны летапіс баявых перамог і працоўных здзяйсненняў у гады савецкай улады сапраўды беспрэцэдэнтны. Брацкія народы Савецкага Саюза разам стварылі магутную эканоміку, навуку, культуру. Беларусь не толькі захавала, але і прымножыла гэты патэнцыял, выбраўшы ўласны шлях развіцця. Уласцівыя нашаму грамадству мір, стабільнасць і згода — заканамерны вынік таго, што мы не адхілілі сацыяльныя заваёвы Вялікага Кастрычніка, не здрадзілі ідэалам раўнапраўя, справядлівасці і бескарыслівага служэння людзям.*

*Мы адны з нямногіх на постсавецкай прасторы, хто аддае даніну павагі гэтай гістарычнай даце. Беларусы не адмаўляюцца ад уласнага мінулага, але і не хочуць паступацца суверэнным правам самастойна вызначаць сваю будучыню.*

*Шчыра жадаю вам, дарагія суайчыннікі, моцнага здароўя, аптымізму, упэўненасці ў сваіх сілах і новых дасягненняў на карысць нашай Радзімы.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## АЎТАРЫТЭТНЫ ФОРУМ

***Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў XXI Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» з адкрыццём форуму.***

*«Трэццяе дзесяцігоддзе сваёй гісторыі «Лістапад» пачынае як аўтарытэтны форум, чыя высокая місія захавання маральных і эстэтычных ідэалаў кінематографа, падтрымкі наватарскіх пошукаў сучасных рэжысёраў знаходзіць водгук ва ўсім свеце.*

*Сёлетні фестываль сабраў у беларускай сталіцы як праслаўленых майстроў, так і таленавітых дэбютантаў, іх работы дэманструюць шырокую панараму сучасных мастацкіх дасягненняў.*

*Упэўнены, што «Лістапад» і надалей будзе служыць справе развіцця кіно як мастацтва, накіраванага на духоўнае ўзвышэнне чалавека, а таксама ўмацаванню дружбы і культурнага супрацоўніцтва паміж народамі.*

*Жадаю ўдзельнікам і гасцям фестывалю натхнення, паспехаў, незабыўных праглядаў і цікавых дыскусій», — гаворыцца ў віншаванні.*

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.11.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10730,00 | ▲ |
| Еўра | 13450,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 241,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 788,54 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Брэнд краіны

# Кунтушовы бляск

## *Шэсць арыгінальных слуцкіх паясоў можна ўбачыць у Мінску*

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі цяпер можна ўбачыць шэсць цэлых арыгінальных слуцкіх паясоў. Праўда, раскоша гэта часовая: паясы прывезлі сюды на экспанаванне з польскага Нацыянальнага музея, што ў Варшаве. СТАР. 3



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



■ КІНО Д'АР

## Шон БЭЙКЕР:

## «ЛЮБЛЮ АСОБАСНАЕ, ГУМАНІСТЫЧНАЕ КІНО»

**Самым выразным і асноватворным падзелам амерыканскага кіно з'яўляецца, мабыць, падзел на «залежнае» і «незалежнае кіно». Што значыць, альбо фільм ствараецца пад патранатам адной з пяці «Студый залатога стагоддзя», альбо рэжысёр вымушаны самастойна шукаць крыніцы фінансавання, магчыма, доўга і цалкам верагодна — беспаспяхова. Трэба дастаць грошы, укласціся ў каштарыс, знайсці людзей, гатовых працаваць за сціплыя ганарары. Часам для стварэння жаданага фільма трэба быць і рэжысёрам, і сцэнарыстам, і аператарам. Але ўсё гэта лёгка пераадольваецца тымі, каму ёсць што сказаць. З сапраўднай любоўю да мастацтва кіно, магчымасцю кінамовы і працэсу стварэння свайго ўласнага фільма рэжысёры здымаюць кіно асобна ад галівудскіх кінагігантаў.** СТАР. 5

■ Здароўе нацыі

# З ДАКЛАДНАСЦЮ ДА МІЛІМЕТРА

## У краіне даступныя ўсе віды неўралагічнага і нейрахірургічнага лячэння і дыягностыкі

**На нядаўнім еўрапейскім кангрэсе нейрахірургаў беларускія спецыялісты мелі магчымасць пазнаёміцца з тэхналогіяй найсучасных апаратыўных умяшанняў на галаўным і спінным мозгу вядучых клінік свету. Кангрэс ахопліваў столькі тэм і аспектаў нейрахірургіі, што толькі адно пералічэнне секцый з тэмамі выступленняў заняло велізарны зборнік. Беларусь нельга назваць фарватарам у галіне навуковай і практычнай нейрахірургіі і неўралогіі, аднак за апошнія гады тут удалося зрабіць так многа, што цяпер у краіне выконваюцца ўсе неабходныя асноўныя хірургічныя ўмяшанні адпаведнага профілю. Сваім вопытам айчынныя вучоныя і практыкі падзяліліся ў межах апошняй рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасныя праблемы дыягностыкі і лячэння неўралагічных і нейрахірургічных захворванняў», што адбылася на базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі. Цэнтр, дарэчы, сёлета адзначыў 90-годдзе. Аб узаемадзеянні навукі і практыкі расказвае дырэктар РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Андрэй ТАНІН.** СТАР. 4



Фота Наталлі АСМОЛЫ.

# Шлях да згоды і дабрабыту

## ЧЫМ ПАЛІТЫЗАВАЦЬ СВЯТА, ЛЕПШ ПАДАРЫЦЬ ДА ЯГО НОВЫ МОСТ ЛЮДЗЯМ

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочую паездку ў Магілёўскую вобласць, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандра Лукашэнку праінфармавалі, як выконваюцца яго даручэнні па развіцці сацыяльнай інфраструктуры і добраўпарадкаванні Магілёва, азнаёмілі з перспектывамі развіцця дарожнай сеткі ў абласным цэнтры і вобласці з выкарыстаннем мясцовых будаўнічых матэрыялаў, а таксама з рэканструкцыяй і капітальным рамонтам моста цераз Днепр у Магілёве.

Прэзідэнту паведамілі аб тым, што наспела неабходнасць рамонту другой важнейшай транспартнай артэрыі Магілёва — моста па Пушкінскім праспекце, які эксплуатуецца з 1959 года. Паколькі размова ідзе аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў, як і пры рамонце першага моста, кіраўнік дзяржавы даручыў разгледзець магчымасць уключэння ў планы на 2016 год мадэрнізацыю яшчэ аднаго моста ў Магілёве.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў звярнуць асаблівую ўвагу на павелічэнне транспартнага патоку праз Беларусь, таксама з улікам сітуацыі ва Украіне. Якасць беларускіх дарог павінна адпавядаць самым сучасным патрабаванням.

Падчас рабочай паездкі Прэзідэнт наведаў магілёўскае ТАА «Протас», якое займаецца выпускам металаканструкцый, у тым ліку стальных маставых вырабаў; азнаёміўся з сучасным абсталяваннем і тэхналагічнымі працэсамі вытворчасці металаканструкцый. Кіраўніку дзяржавы далажана аб тым, як рэалізуецца інвестыцыйны праект па будаўніцтве завода маставых металічных канструкцый. Аляксандр Лукашэнка станоўча ацаніў работу прадпрыемства.

***

У час размовы Прэзідэнта з работнікамі прадпрыемства задаваліся розныя пытанні. Адзін з маладых супрацоўнікаў закрануў тэму прадаўжэння навуковай работы ў час вытворчай дзейнасці, якая яго хвалюе, і выказаў сваю асцярогу наконт будучай абароны дысертацыі.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка сказаў, што падтрымлівае навуковую дзейнасць, звязаную непасрэдна з вытворчай тэматыкай. «Калі вы ўзяліся за дысертацыю і напішаце аб патрэбнай, перспектыўнай тэме, а тым больш зробіце адкрыццё, гэтая дысертацыя, безумоўна, атрымае падтрымку», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

Закранalася падчас размовы і пытанне падтрымкі прыватнікаў, якія ствараюць вытворчасці. «Тым, хто стварае прадпрыемствы, вытворчасці за ўласныя або за крэдытныя сродкі, будзе толькі падтрымка», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён адзначыў, што ў яго асаблівае стаўленне да прыватызацыі: «Мы прыватызуем прадпрыемствы, але не ўсё без разбору, як у некаторых краінах. Калі бачым, што прадпрыемства дрэнна або слаба працуе, мы прапануем: няхай прыватнік купляе, але не за бясцэнак, і працуе». У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў сельскую гаспадарку, дзе амаль трэць калгасаў і саўгасаў прыватызаваны. «І гэты працэс будзе працягвацца», — дадаў ён.

Цікавіла работнікаў прадпрыемства і дапамога маладым сем'ям. Прэзідэнт падкрэсліў, што ўсё магчымае ў краіне ў гэтым напрамку робіцца. «Будзе магчымасць — абавязкова павялічым падтрымку, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але крыху трэба напружыцца і маладым сем'ям». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што грошы ў першую чаргу трэба зарабіць, і цяпер у Беларусі гэта зрабіць можна. Больш мабільнымі павінны быць і самі людзі, пераязджаючы ў тыя мясціны, дзе ўжо ёсць жыллё і праца.

Была ўзнята і надзвычай актуальная на сёння тэма дармаедаў. Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў жорсткае патрабаванне, каб іх прымушалі працаваць. Паводле яго слоў, сёння ў краіне каля 400 тысяч гультаёў. Але гэта не датычыцца тых, хто працуе ў Расіі. «Маўляў, Лукашэнка прымушае ўсіх, хто працуе ў Расіі, вярнуцца. Гэта не так. Зарабляеце, прысылаеце сюды грошы, — гэта ваш уклад. Размова ідзе пра іншых — пра гультаёў, якія не працуюць ні ў Беларусі, ні ў Расіі, ні ў іншых краінах», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Адказнасць дзяржавы зразумелая — гэта клопат аб дзецях, адукацыя, ахова здароўя. Гэта абарона і бяспека і шмат іншага. А для гэтага таксама патрэбны грошы, — сказаў Прэзідэнт. — Але калі вы скажаце, што для гэтага грошы не патрэбны, тады мы зробім некалькі хуткіх крокаў да таго, што адбываецца ва Украіне». Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў, што на дзяржаўным узроўні будуць прыняты неабходныя захады для барацьбы з дармаедствам.

Паколькі сустрэча адбывалася перад святам 7 лістапада, Прэзідэнт выказаў і сваё стаўленне да яго. «Ніякага палітычнага сэнсу ў гэтае свята я не ўкладваю. Людзі прывыклі яго адзначаць. І чаму трэба яго адмяняць?» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён растлумачыў: «Я працўнік рэвалюцый, як і вы, але тады людзі змагаліся за лепшае жыццё». Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што ён не прыхільнік таго, каб ламаць гісторыю і перайменоўваць даты. «Гэты дзень трэба захаваць як дзень прамежкавай справаздачы перад народам. Не раю палітызаваць гэтае свята, трэба больш думаць аб практычным — будаваць новыя масты, дамы, вытворчасці. Гэта галоўны сэнс, які мы ўкладваем у свята», — адзначыў беларускі лідар.

### ■ Парламенцкі дзённік

## Агульная справа

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, што вылучаліся з Брэсцкай вобласці, **Віктар ВАЛЮШЫЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы, і Уладзімір БАЗАНАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнай бяспецы,** сустрэліся з дэлегацыяй грамадскага аб'яднання «Белая Русь», якая прыехала з гэтага рэгіёна нашай краіны. Актыў абласнога аб'яднання пазнаёміўся з працай ніжняй палаты беларускага парламента, гісторыяй Дома ўрада.

— Арганізацыя імкнецца выйсці на такі ўзровень, калі можна актыўна супрацоўнічаць з дэпутатамі, якія з'яўляюцца членамі «Белай Русі», — падкрэсліў падчас выступлення перад дэпутатамі **Васіль ЛАШЧ, намеснік старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі аб'яднання.**

Гэта трэба для таго, каб сістэматызаваць звароты ад грамадзян і перадаваць іх для прапрацоўкі ў парламент. Васіль Лашч звярнуў увагу на тое, што вельмі добра сябе паказалі грамадскія прыёмныя «Белай Русі».

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

### ■ Меркаванне чытачоў

## ДЗЕНЬ-ГІСТОРЫЯ

**Напярэдадні Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі мы пацікавіліся ў нашых чытачоў, якое значэнне мае для іх гэты дзень сёння. Звычайны выхадны ці ўсё ж такі свята?**

**Андрэй НАВУМОВІЧ,**
***старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:***

— Гэты дзень мае вялікае значэнне для гісторыі маёй сям'і. У тым далёкім 1917 годзе мой дзед, якому тады было 19 гадоў, прысутнічаў у Пецярбургу на Другім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, калі і быў прыняты Дэкрэт аб міры. Мой дзед быў простым салдатам, і для яго гэтая падзея адыграла вялікую ролю. Пазней да яго прыходзілі піянерскія дружыны і прасілі як сведку расказаць пра той дзень.

Ад сябе заўважу, што з гісторыяй трэба абыходзіцца вельмі беражліва. Слушна сказаў у свой час Расул Гамзатаў, славуты паэт і публіцыст: «Калі ты стрэліш у мінулае з пісталета, будучыня стрэліць у цябе з гарматы».

**Галія ЕСЕНБАЕВА,**
***старшыня міжнароднага грамадскага аб'яднання казахаў «Ата-Мекен»:***

— У савецкія часы, на якія прыпалі мае школьныя і студэнцкія гады, 7 лістапада было чырвоным днём календара. Менавіта так яго заўсёды і называлі. У нас, у Казахстане, у гэты дзень, а таксама 1 мая школьнікі і студэнты выходзілі на парад. Нас сустракалі святочна апранутыя гараджане, усё было вельмі ўрачыста. Пасля парада заўсёды арганізоўваліся канцэрты, людзі маглі пасядзець з сябрамі ў маленькіх утульных кавярнях.

Цяпер я ў гэты дзень займаюся, як правіла, сямейнымі справамі. Вось і гэтыя вялікія выхадныя я вырашыла прысвяціць дачным клопатам — паеду за горад, каб укрыць ружы на зіму.

**Анжаліка РЫХЛІЦКАЯ,**
***студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:***

— Напэўна, няма сярод сучаснай моладзі тых, хто б не ведаў, што 7 лістапада — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яшчэ з урокаў па гісторыі мы памятаем, што менавіта ў гэты дзень працоўныя захапілі Зімні палац, звергнулі Часовы ўрад і аб'явілі ўладу Саветаў. Безумоўна, Кастрычніцкая рэвалюцыя — значная падзея ў гісторыі маёй краіны. Але асабіста я ніяк не вылучаю гэты дзень сярод шэрагу іншых. Для мяне ён не стаіць нароўні з такімі святочнымі днямі, як Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці, той жа Новы год. Ён не адзначаецца ні ў маёй сям'і, ні ў сем'ях родных і сяброў. Аднак гэта не перашкаджае ставіцца з павагай да таго, што для маіх продкаў было надзённым.

**Валянціна ЧУДАЕВА,**
***ветэран Вялікай Айчыннай вайны:***

— 7 лістапада — дзень яднання многіх народаў. Гэта дзень нараджэння новай эры, лепшага жыцця. Кастрычніцкая рэвалюцыя дала нам бясплатную вышэйшую адукацыю, медыцынскае абслугоўванне, шырокія магчымасці ў зносінах паміж народамі. Сучаснае грамадства яшчэ шмат чым абавязана гэтай гістарычнай падзеі.

Увесь Савецкі Саюз адзначаў Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі. Усюды іграла музыка, гучалі песні, развіваліся сцягі. Была цудоўная нагода ўсім яшчэ раз сабрацца. Гэта святы дзень, у тым ліку дзень, за які я ваявала, аддавала сваю маладосць і здароўе. Гэтае свята нарадзіла Вялікую краіну, якую мы абаранялі на фронце, адстойваючы ранейшыя заваяванні.

**Вераніка КАНЮТА, Надзея ЮШКЕВІЧ**

### ■ Жыллё

# ШМАТДЗЕТНЫМ — У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

## НАЛЕТА Ў МІНСКУ ПЛАНУЮЦЬ ПАБУДАВАЦЬ 131 ТЫСЯЧУ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ ЖЫЛЛЯ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ

**Згодна з адпаведнай пастановай Саўміна, сёлета ў галоўным мегаполісе краіны неабходна пабудаваць 1 млн квадратных метраў жылля. З гэтым заданнем пакуль сталіца спраўляецца, бо за 9 месяцаў ужо ўведзена ў эксплуатацыю 865 тысяч, паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Аляксандр АЎРАМЕНКА. Для грамадзян, якія будуюцца з дзяржпадтрымкай, уведзена ў эксплуатацыю 228 тысяч, а па лініі жылля камерцыйнага выкарыстання — 29,5 тысячы квадратных метраў.**

### Ведаць свой будучы адрас

На наступны год Мінэканомікі запланавала для горада будаўніцтва 900 тысяч жылых «квадратаў», з якіх каля 400 тысяч будзе ўведзена з дзяржпадтрымкай, 105 тысяч — для шматдзетных і 60 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля. Дзяржзаказ у сталіцы складзе 14,7 тысячы квадратных метраў.

Гэта агульныя лічбы, аднак самым актуальным напрамкам для сталіцы застаецца будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў. Для гэтай катэгорыі ў Мінску была распрацавана спецыяльная праграма па будаўніцтве жылля на 2015–2017 гады. Дакументам на кожны год прадугледжаны пэўныя аб'ёмы будаўніцтва з канкрэтнымі адрасамі будучых дамоў. Уласны план ужо зацверджаны мэрыяй, па якім у 2015 годзе плануюць пабудаваць 131 тысячу, у 2016-м — 169 тысяч, а ў 2017-м — 170 тысяч квадратных метраў жылля, паведаміў **намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Аляксандр СЦЯПАНАЎ.**

Такім чынам, у наступным годзе па два дамы для шматдзетных сем'яў узвядуць у Заводскім і Цэнтральным раёнах, чатыры — у Ленінскім, шэсць — у Маскоўскім, тры — у Партызанскім і дзесяць — у Фрунзенскім раёне. Па большасці гэтых дамоў ужо падрыхтавана адпаведная дакументацыя, а частка з іх знаходзіцца на стадыі будаўніцтва.

### Новыя сталічныя ўласнікі

Беларускае заканадаўства цяпер дазваляе атрымліваць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва ўласнага дома ў сталіцы толькі шматдзетным сем'ям. Спачатку ахвотнікаў будавацца на зямлі было сапраўды шмат. Аднак сёння трэба ўлічваць той факт, што дзяржаўная падтрымка цяпер прадугледжваецца толькі на адзін з відаў паляпшэння жыллёвых умоў: альбо на будаўніцтва індывідуальнага жылога дома, альбо на будаўніцтва кватэры. Сёння ў спісах шматдзетных, якія жадаюць атрымаць зямельны ўчастак для будаўніцтва індывідуальнага жылога дома, у Мінску знаходзіцца 185 сем'яў. Ужо ў бліжэйшы час Мінгарвыканкам плануе дапоўніць пералік зямельных участкаў для гэтай катэгорыі чаргавікоў.

### Акцэнт на арэнднае жыллё

Аляксандр Аўраменка адзначыў, што толькі сёлета ў сталіцы пабудавана больш за 700 арэндных кватэр, а яшчэ каля 1400 такіх жылых памяшканняў знаходзяцца ў стадыі будаўніцтва. У бліжэйшы час у горадзе складуць план-графік будаўніцтва і ўводу ў эксплуатацыю такіх дамоў. А ўвогуле арэндныя кватэры сталі вельмі папулярнымі сярод жыхароў Мінска, бо арэндная плата непараўнальная з той, якую людзі плацяць, здымаючы самастойна жыллё ў прыватным сектары. «Яна ў нас у два, а дзе і ў тры разы меншая», — сказаў начальнік упраўлення. Так, напрыклад, у Заводскім раёне кошт арэнды стандартнай аднапакаёвай кватэры складае 550–570 тысяч рублёў, а ў асобных дамах па вуліцы Карастаянавай такія кватэры здаюцца па цэнніку ад 1,2 да 1,5 млн рублёў.



Попыт на такое жыллё ў сталіцы ажыятажны. У Мінску на адну арэндную кватэру прыпадае ад 100 да 400 прэтэндэнтаў. У першую чаргу «арэнду» ад дзяржавы атрымліваюць тыя, хто раней меў права на сацыяльнае жыллё: пракуроры, суддзі, навукоўцы, дзеячы культуры і іншыя. Гэтая катэгорыя льготнікаў атрымлівае прыкладна 40% ад усяго аб'ёму арэндных кватэр. Астатняя доля арэндных памяшканняў размяркоўваецца сярод жыллёвых чаргавікоў пасля таго, як чалавек пакіне адпаведную заяўку ў мясцовым выканкаме. Тут перавага застаецца за тымі, хто прастаяў у чарзе большую колькасць гадоў. Больш за тое, сям'я з рэгістрацыяй Фрунзенскага раёна Мінска можа падаць заяву ў Першамайскі раён і, калі пашанцуе, атрымаць там арэнднае жыллё.

Пры гэтым грамадзяне, якія атрымліваюць арэнднае жыллё ад прадпрыемстваў і арганізацый, на якіх працуюць, з чаргі маючых патрэбу не здымаюцца.

Асобна трэба адзначыць некалькі момантаў наконт зняцця з жыллёвай чаргі тых, хто атрымаў ад горада арэнднае жыллё раней ці праз механізм пераводу са службовага жылля. Дык вось, тыя грамадзяне, якім здымнае жыллё камерцыйнага выкарыстання адміністрацыя дала сёлета да 1 красавіка, і яны там працягваюць жыць, з жыллёвай чаргі не здымаюцца. Другая сітуацыя тычыцца тых, хто ў свой час жыў у службовай кватэры, якая была пераведзена ў ранг жылля камерцыйнага выкарыстання. У гэтым выпадку такія жыльцы пасля 1 красавіка атрымалі новыя правы і абавязкі. Цяпер, пры забяспечанасці такім жыллём больш як 10 квадратных метраў на чалавека, сям'я ці грамадзянін з жыллёвай чаргі здымаецца.

**Сяргей КУРКАЧ**

ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, НАВІНЫ

## ДЗЕЦІ АТРЫМАЛІ СЯМ'Ю

**Дом сямейнага тыпу ўрачыста адкрыюць сёння ў пасёлку Мірны Баранавіцкага раёна. Двухпавярховы прыгожы дом за сродкі абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў будаўнікі ўзвялі менш чым за год. Яго ўжо засяліла новая сям'я: бацькі Надзея Мікалаеўна і Уладзімір Мікалаевіч Якубовічы, іх дачка і шасцёра прыёмных дзяцей.**

Прыёмныя дзеці, якія паступілі сюды, розных узростаў — ад 13 да трох гадоў. Гэтыя хлопчыкі і дзяўчынкі нарадзіліся ў двух сем'ях, па трое ў кожнай. Іх біялагічныя бацькі, жыхары Баранавіцкага раёна, былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Дзеці жылі некаторы час у прытулках і дзіцячых дамах. І вось нарэшце яны аказаліся ў сапраўднай сям'і.

Паводле слоў **старшыні Малахавецкага сельскага Савета Васіля ВАЛАДКЕВІЧА**, у мясцовай улады ёсць усе падставы спадзявацца, што ў новым доме пасялілася сапраўды дружная і моцная сям'я. Маці гэтай сям'і Надзея Мікалаеўна, можна сказаць, з дынастыі выхавальнікаў. Яе маці працуе ў доме сямейнага тыпу ў Крошыне. Таму Надзея не прабліізна ведае гэту работу, знаёмая з цяжкасцямі і праблемамі бацькоў-выхавальнікаў. І выбар свой зрабіла свядома.

У Брэсцкай вобласці гэта будзе 36-ы дом сямейнага тыпу. І ў той жа дзень у Івацэвіцкім раёне адкрываецца 37-ы, а праз некалькі дзён запланавана адкрыццё падобнай установы ў Баранавічах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЛІСТАПАД СУСТРАКАЕМ НАВАСЕЛЛЕМ

**Напярэдадні свята 7 лістапада Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала для сваіх супрацоўнікаў выдатны падарунак. У вёсцы Баравая, што пад Мінскам, здалі ў эксплуатацыю новы шматпавярховы жылы дом.**

Як паведаміла «Звяздзе» **Ірына ВЫШАМІРСКАЯ, начальнік групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента выканання пакаранняў МУС РБ**, дзевяціпавярховік у прысталічнай вёсцы дзякуючы намаганням Салігорскага домабудаўнічага камбіната вырас за год. Кватэры тут здаюцца з неабходнай сантэхнікай, газавымі плітамі… Большасць членаў кааператыва атрымала дзяржаўную падтрымку на будаўніцтва кватэр у выглядзе льготнага крэдытавання. Увогуле наваселле ў 126-кватэрным доме ў гэтыя дні адзначаць 96 сем'яў супрацоўнікаў крымінальна-выканаўчай сістэмы, наваспечаных жыхароў павіншуюць высокапастаўленыя госці, адбудзецца выступленне аркестра.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## ЦЭГЛУ — У ПРЫБАЛТЫКУ

**Пад Віцебскам запрацавала прадпрыемства па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў па інавацыйнай тэхналогіі.**

У гарадскім пасёлку Руба Віцебскага раёна на новым заводзе з даламіту, які тут жа і здабываецца, цяпер вырабляюць гіперпрэсаваныя цэглу і плітку. Аб'ём інвестыцый у стварэнне новай вытворчасці склаў больш за 5 мільёнаў долараў ЗША. Прадпрыемства належыць ТАА «РуБелЭка», якое займаецца вырабам будаўнічых матэрыялаў. Прадукцыя рэалізуецца не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў Расіі. У бліжэйшы час плануецца наладзіць экспарт і ў прыбалтыйскія краіны.

Штогод на новым заводзе будуць вырабляць каля 15 мільёнаў штук умоўнай цэглы.

Выбраная тэхналогія вытворчасці дазваляе ствараць экалагічна чыстую прадукцыю, якая адрозніваецца ад аналагаў строгай геаметрычнай дакладнасцю і выключнымі эстэтычнымі якасцямі. На заводзе ўсталявалі тэхналагічную лінію з высокай ступенню аўтаматызацыі, якая дазваляе звесці да мінімуму ўплыў чалавечага фактару.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## СУЧАСНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

**Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне справіў уваходзіны ў трохпавярховым будынку плошчай каля 3,5 тысячы квадратных метраў.**

Дзякуючы сродкам дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы (затрачана каля 36 мільярдаў рублёў) вырашана праблема гродзенскіх архівістаў з размяшчэннем і захоўваннем фондаў, паколькі новыя плошчы больш чым у 4 разы перавышаюць ранейшыя. Умовы для захоўвання гістарычных дакументаў і навукова-даведачных выданняў цяпер адпавядаюць найлепшым еўрапейскім стандартам. Дарэчы, там спецыяльна няма вокнаў, каб пазбегнуць адмоўнага ўплыву сонечнага святла на даўнюю паперу.

Ёсць у новым будынку і выставачная зала. З нагоды ўваходзін там адкрылася экспазіцыя кніг па гісторыі Гродна, прадметаў, якімі карысталіся архівісты ў XIX–XX стагоддзях. Таксама прадстаўлены копіі дакументаў з аўтографамі вядомых асоб. Прычым яны зроблены на даўнейшай паперы, якая захавалася ў архіве.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## НА СВЯТА ЎСЯГО БАГАТА

**Шмат прыемных падарункаў атрымаюць жыхары Магілёўшчыны напярэдадні 7 лістапада. Гасцінна расчыняць дзверы яслі-сад № 116 у самым маладым мікрараёне Магілёва — Спадарожнік.**

Гэта ўжо другая падобная ўстанова, якая адкрываецца ў гэтым густанаселеным месцы на працягу года. Сучасны трохпавярховы будынак разлічаны на 240 дзяцей, якія будуць займацца тут у 13 групах. Для развіцця гарманічнай асобы ў садку створаны ўсе ўмовы. Маюцца музычная і спартыўная залы, ёсць басейн. Па апошнім слове тэхнікі абсталяваны медыцынскі і харчовы блокі. Прадугледжаны ўмовы для павышэння кваліфікацыі саміх работнікаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Сфера інтарэсаў

# ЗАЙМЕЦЬ СВОЙ «ДАМОК» У АНТАРКТЫДЗЕ

**Беларускія палярнікі адправяцца ў новую антарктычную экспедыцыю, якая будзе праходзіць са снежня 2014 па красавік 2015 года. Урачыстыя правады ўдзельнікаў сёмай экспедыцыі адбыліся ў сценах Нацыянальнай акадэміі навук.**

А напярэдадні на борт навукова-экспедыцыйнага судна «Акадэмік Фёдараў» у Санкт-Пецярбург былі адпраўлены 4 тоны экспедыцыйнага грузу, у які ўвайшлі прыборы для навуковых назіранняў, сродкі сувязі і экспедыцыйны рыштунак. Беларускія навукоўцы накіроўваюцца на Паўднёвы полюс у складзе 60-й расійскай антарктычнай экспедыцыі.

Удзельнікамі беларускай антарктычнай экспедыцыі сталі пяць чалавек: начальнік экспедыцыі Аляксей Гайдашоў (Рэспубліканскі цэнтр палярных даследаванняў), інжынер-эколаг Уладзіслаў Мямін (БДУ, дацэнт кафедры мікрабіялогіі), інжынер-геафізік Павел Шаблыка (Інстытут прыродакарыстання НАН Беларусі), інжынер-радыёметрыст Міхаіл Кароль (навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі НАН Беларусі) і інжынер-механік Уладзімір Алфімаў (МАЗ).

Сёмая экспедыцыя — асаблівая, паколькі ў наступным годзе плануецца ўстаноўка першай секцыі модуля Беларускай антарктычнай станцыі. Задача палярнікаў — правесці работы па інжынерным абсталяванні пляцоўкі. Падчас экспедыцыі будуць праводзіцца даследаванні па пяці навуковых напрамках, у тым ліку выконвацца работы ў інтарэсах нацыянальнай касмічнай праграмы. Таксама члены экспедыцыі правядуць выпрабаванні новых тэхнічных сродкаў беларускіх распрацоўшчыкаў для дыстанцыйнага зандзіравання прыроднага асяроддзя. Будзе праведзены маніторынг марскіх, прэснаводных і наземных біялагічных рэсурсаў прыбярэжных экасістэм Антарктыкі, зроблена ацэнка стану навакольнага асяроддзя.

Сёння знаходжанне беларусаў у Антарктыцы магчымае толькі дзякуючы падтрымцы расійскіх калег. Беларускія навукоўцы працуюць на ледзяным кантыненце ў складзе расійскіх антарктычных экспедыцый і базіруюцца там на расійскіх палярных станцыях. Але абсалютна ўсе ўпэўнены, што наяўнасць сваёй палярнай станцыі — гэта выхад на прынцыпова новы ўзровень.

Плануецца, што першую чаргу станцыі пабудуюць да 2018 года. Аб'ект будзе складацца з 8–10 модуляў памерам з марскі кантэйнер і збірацца, як канструктар. Прадугледжаны аўтаномнае энергазабеспячэнне кожнага модуля (гэта значыць, што ў кожным модулі будзе свой генератар на аварыйныя выпадкі), клімат-кантроль, сістэма сувязі паміж модулямі,



навігацыйныя сістэмы. Але самае галоўнае — модулі не патрабуюць капітальнага будаўніцтва. З борта карабля яны верталётам будуць дастаўляцца на ўзбярэжжа, і для іх установкі не спатрэбяцца ні краны, ні бульдозеры. Да таго ж станцыя лёгка дэмантуецца.

А глабальныя збудаванні ў выглядзе нафтабазы, ачышчальных збудаванняў пастаяннага замкнутага цыкла запланаваныя на другі этап — з 2018 па 2025 год.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# КУНТУШОВЫ БЛЯСК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Выстава працягнецца да 6 красавіка 2015 года, так што ўбачыць паясы яшчэ паспее кожны, нават і не сталічны жыхар. А зрабіць гэта сапраўды варта, бо толькі ўбачыўшы на свае вочы слуцкія паясы, пачынаеш усведамляць, што яны не міфічны прывід гісторыі, а сапраўдныя творы сусветнай мастацкай культуры. Іх можна паставіць у адзін шэраг, напрыклад, з расійскімі яйкамі Фабержэ, з амерыканскімі шклянымі вырабамі Тыфані. Зробленыя ў адным стылі выбітнымі майстрамі, яны адразу былі прызнаны шэдэўрамі. Так і са слуцкімі паясамі: убачыўшы арыгіналы, адразу пачынаеш іх любіць і разумець, чаму менавіта яны абраны брэндам краіны.

Слуцкія паясы зроблены ў тэхніцы ткацтва, з выкарыстаннем металізаваных золатам і серабром нітак. На ўсіх шасці вырабах, прывезеных у Мінск, можна ўбачыць «цвяток радзімы васілька». Ды і ўвогуле матывы, выкарыстаныя ў іх аздабленні, падаюцца вельмі роднымі — пазнаеш чыстую, сціплую, але годную і велічную прыгажосць нашай краіны. Глядзіш на іх — і ва ўяўленні міжволі ўсплываюць прасторы нашых палёў, някідкія прываблівыя краскі, што цвітуць на іх. Слуцкія паясы звычайна мелі даўжыню ад двух да пяці метраў. Былі яны, як правіла, двухбаковымі, але часам рабілі і чатырохбаковыя (белым бокам на вяселле, чырвоным — на імяніны і ўрачыстасці, шэрым — на афіцыйныя прыёмы, чорным — на жалобныя цырымоніі). Надзвычай прыемна ўсё гэта самому ўбачыць на выставе.

***У Рэчы Паспалітай кунтушовы пояс быў абавязковым аксесуарам мужчынскага адзення. Насілі яго звычайна паверх кунтуша — верхняй вопраткі з разрэзанымі спушчанымі рукавамі. У XVII — XVIII стагоддзях шаўковыя паясы з залатымі і сярэбранымі ніткамі сталі моднай дэталлю касцюма вышэйшага саслоўя ва ўсёй Еўропе.***



Урачыстае адкрыццё выставы.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Аднак ва ўласнасці Нацыянальнага мастацкага музея дагэтуль няма ні аднаго (!) цэлага слуцкага пояса. Ёсць толькі два фрагменты. А таксама некалькі паясоў у арнатах — літургічным адзенні, пашытым з іх. Для параўнання, у Нацыянальным музеі Варшавы, які прывёз у Мінск толькі невялікую частку сваёй калекцыі, ёсць 58 слуцкіх паясоў.

Супрацоўнікі нашага музея патлумачылі, што да Вялікай Айчыннай вайны ў карціннай галерэі (сучасным Нацыянальным мастацкім музеі) было 48 слуцкіх паясоў. Сюды, дарэчы, яны ў 1939 годзе былі перавезены з Нясвіжскага палаца. Аднак падчас вайны ўсе паясы зніклі.

Польскія музейшчыкі могуць пахваліцца такой багатай калекцыяй дзякуючы Катажыне Патоцкай, якая збірала паясы (усяго яна мела 250 такіх вырабаў, не толькі слуцкіх). Пасля вайны яна (або яе нашчадкі) перадалі ўсю калекцыю Варшаўскаму музею.

**Генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір ПРАКАПЦОЎ** паведаміў карэспандэнту «Звязды», што ў наступным годзе музей плануе набыць некалькі арыгінальных слуцкіх паясоў. Загадчык аддзела старажытнабеларускага мастацтва гэтай установы Алена Карпенка дадала, што гэтыя паясы, верагодна, набудуць у калекцыянера. Па яе словах, слуцкія паясы сёння часам з'яўляюцца і на аўкцыёнах, але музей, як дзяржаўная ўстанова, не можа ў іх удзельнічаць. Бо на любым аўкцыёне грошы за набыты лот трэба пералічыць не пазней чым за 20 дзён пасля заключэння здзелкі. Музей жа з-за асаблівасцяў яго фінансавання ў такія тэрміны ўкласціся не паспявае.

Напрыканцы мінулага года, дарэчы, адзін арыгінальны слуцкі пояс набыў краязнаўчы музей у Слуцку («Звязда» пісала пра гэта 14 студзеня 2014 года). Усяго ж у Беларусі цяпер 6 арыгінальных слуцкіх паясоў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Будзь у курсе

# БІЛЕТЫ ДА АЭРАПОРТА МОЖНА НАБЫЦЬ ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

**Беларуская чыгунка адкрыла продаж білетаў на цягнікі, якія ідуць да Нацыянальнага аэрапорта «Мінск».**

Іх можна набыць ва ўсіх рэгіёнах краіны ў пунктах афармлення праязных білетаў, уключаючы плацежна-даведачныя тэрміналы самаабслугоўвання. Два такія тэрміналы былі ўстаноўлены на дзвюх платформах станцыі «Мінск-Пасажырскі», з якой штодня будуць адыходзіць цягнікі ў аэрапорт.

— Для ўсіх тэрміналаў чыгункі была распрацавана новая версія праграмнага забеспячэння і зменены інтэрфейс экранаў, на якіх з'явілася «кнопка» «У Нацыянальны аэрапорт «Мінск». Каб набыць білет з выкарыстаннем тэрмінала, неабходна націснуць гэтую «кнопку», уставіць у прыладу плацежную картку, выбраць маршрут («Мінск-Пасажырскі» — Нацыянальны аэрапорт ці Смалявічы — Нацыянальны аэрапорт) і аплаціць праезд,— расказалі ў прэсцэнтры магістралі.— У білетных касах і тэрміналах самаабслугоўвання Беларускай чыгункі праязныя дакументы ў Нацыянальны аэрапорт «Мінск» можна набыць за 10 сутак да адыходу цягніка. Апроч таго, у дзень адпраўлення набыць білет можна непасрэдна ў цягніку ў білетных касіраў ці праз плацежныя тэрміналы самаабслугоўвання, усталяваныя ў аэрапорце.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

Прамая лінія

# І ШТРАФУ НЕ БАЯЦЦА...

## За п'янства на вуліцы працягваюць складаць тысячы пратаколаў


Фота Вячаслава ЦУРАНАВА.

**За 9 месяцаў гэтага года ў краіне зарэгістравалі 250 тысяч правапарушэнняў, звязаных з распіццём алкагольных напояў і знаходжаннем у п'яным стане ў грамадскіх месцах. У Мінску ўжо выяўлена 45 тысяч падобных злачынстваў. Вышэйзгаданую статыстыку на ведамасній «прамой лініі» агучыў Мікалай МЕЛЬЧАНКА, намеснік міністра ўнутраных спраў.**

— Праблема падобных правапарушэнняў застаецца для нас актуальнай, — адзначыў Мікалай Мельчанка. — За падобнае парушэнне закона прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры да 1 млн 250 тыс. рублёў. У паўторным выпадку — арышт на 15 сутак альбо штраф 2 млн 250 тыс. рублёў. У сваю чаргу, МУС прапаноўвае дапоўніць Закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай, спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту» абмежаваннем, якое прадугледзіць забарону на гандаль алкагольнымі напоямі з 22.00 да 9.00.

Варта дадаць, што ва ўсіх рэгіёнах Беларусі дзейнічаюць кругласутачныя «прамыя лініі» «П'янству — не!», куды можа патэлефанаваць любы ахвотны і распавесці пра выпадкі незаконнага вырабу і распаўсюджвання алкаголю.

Удзельнікі «прамой лініі», акрамя асабістых пытанняў, скардзіліся пра набалелае: на шумных матацыклістаў, якія спаць не даюць, на адсутнасць у сталіцы парковак...

Што тычыцца шалёных матагоншчыкаў, у Савеце Міністраў ужо знаходзяцца на разглядзе прапановы па ўпарадкаванні руху гора-матацыклістаў. Сярод іх, напрыклад, «забарона на ўдзел у дарожным руху транспартных сродкаў (найперш матацыклаў), узровень знешняга акустычнага шуму якіх перавышае гранічна дапушчальныя нормы і значэнні».

У сваю чаргу, карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў намесніка міністра аб праблеме шумных суседзяў, на якіх час ад часу газеце скардзяцца чытачы, пытаючы, як іх можна супакоіць. Жыццё чалавека ў шматкватэрным доме рэгламентуецца правіламі карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў. І калі ты празмерна шуміш, курыш на лесвічнай пляцоўцы і калідоры, самавольна перабудоўваеш кватэру, выкарыстоўваеш не па прызначэнні жылое памяшканне, будзь гатовы панесці адміністрацыйную адказнасць і атрымаць штраф ад 10 да 30 базавых велічынь (ад 1,5 да 4,5 млн рублёў). Складаць адміністрацыйныя пратаколы маюць права супрацоўнікі мясцовых выканкамаў, ЖЭСаў.

Адказваючы на пытанне пра праблему з паркоўкамі ў сталіцы, Мікалай Мельчанка заўважыў, што да канца 2014 года ў Мінску павінны з'явіцца 200 тысяч машына-месцаў, а да 2020 года — 400 тысяч. Аналагічнае пытанне актуальна і для іншых буйных гарадоў краіны. У Брэсце дадаткова неабходна падрыхтаваць больш за 5 тысяч машына-месцаў, у Магілёве — 10 тысяч, а ў Гомелі — 34 тысячы. Намеснік міністра ўнутраных спраў таксама нагадаў, што за спыненне ці стаянку аўтамабіля з парушэннем правілаў дарожнага руху прадугледжаны штраф у памеры 150 тысяч рублёў, за паўторнае парушэнне — 300 тысяч рублёў.

**Тарас ШЧЫРЫ**

# З ДАКЛАДНАСЦЮ ДА МІЛІМЕТРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Вы памятаеце сваю першую аперацыю ў якасці нейрахірурга? Яна павінна была вельмі адрозніваца ад тых, якія праводзяцца сёння...***

— Айчынная нейрахірургія неверагодна змянілася. Літаральна праз паўгода пасля таго як я прыйшоў у Беларускі навукова-даследчы інстытут нейрахірургіі і фізіятэрапіі (так тады называўся цэнтр), пачаў далучацца да аперацый. Нейрахірургаў на той момант было па пальцах пералічыць... Праўда, да гэтага тры гады адпрацаваў медбратам (выязджаў на выклікі «хуткай дапамогі» па Мінскай вобласці) і добра ўяўляў, што такое чэрапна-мазгавая траўма. Вось маё самастойнае першае хірургічнае ўмяшанне было звязана менавіта з вострай унутрычарапной мазгавой траўмай, якую атрымаў малады чалавек.


Фота Наталлі АСМОЛЫ.

**Андрэй ТАНІН (справа) і акадэмік, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык нейрахірургічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, Арнольд СМЕЯНОВІЧ.**

Нейрахірургія 30-50 гадоў таму і сёння — гэта неба і зямля. У першую чаргу — з-за магчымасцяў дыягностыкі. Яна абапіралася некалі толькі на рэнтгенаўскія здымкі, якія забяспечваюць вельмі сціплую інфармацыю, не паказваюць, напрыклад, дзе і як размяшчаецца тая ж пухліна. Па сутнасці, дыягназ выстаўляўся, зыходзячы са скаргаў пацыента, клінічных праяў. Удакладніць дыягназ можна было толькі непасрэдна на аперацыйным стале. Сёння ў нашым распараджэнні — камп'ютарныя і магнітна-рэзанансныя тамографы, якія вызначаюць паталогіі ў галаўным і спінным мозгу (дый наогул ва ўсім арганізме) з дакладнасцю да міліметра. Камп'ютарны тамограф — гэта рывок у развіцці медыцыны ўсяго свету.

**Анеўрызма — змяненне сасудзістай сценкі ў выніку расцягвання іх станчэння — можа не выклікаць ніякіх сімптомаў ажно да самай катастрофы, калі пад уздзеяннем самых розных прычын сасуд ірвецца і кроў выліваецца ў поласць чэрапа.**

***— Найсучаснейшая апаратура здольная кампенсаваць адсутнасць урачэбнага вопыту? Можа, тэхналогія ўжо больш важная за чалавечы фактар?***

— Любая аперацыя залежыць у першую чаргу ад урача. Інструментарый, апаратура, абсталяванне толькі дапамагаюць яму выконваць тое ці іншае ўмяшанне. Вопыт тут вельмі важны. А для маладога хірурга самым важным будзе пастаяннае імкненне набываць гэты вопыт. Адсутнасць апошняга нейкім чынам можа кампенсаваць на першым часе гарачае жаданне дапамагчы.

Сёння наш цэнтр неўралогіі знаходзіцца на вельмі добрым узроўні — і па кадрах, і па тэхнічным забеспячэнні. У цэнтры працуе 9 дактароў навук, 8 з якіх — прафесары. Усе займаюцца і навуковай, і практычнай дзейнасцю. Адтоку кадраў практычна няма, паколькі створаны ўсе ўмовы для нармальнай работы. Ва ўсіх аддзяленнях працуюць спецыялісты розных пакаленняў, што стварае ўмовы для падрыхтоўкі кадраў на месцы. Аднак мы не ўпускаем выпадку накіроўваць спецыялістаў на стажыроўкі ў іншыя краіны. Дарэчы, напярэдадні адкрыцця цэнтра ўвесь персанал стажыраваўся ў такіх краінах, як Францыя, Германія, Ізраіль, ЗША, Расія. Гэта было неабходна для атрымання навыкаў работы на новым абсталяванні — эндаскопах, тамографах, мікраскопах і г.д. Такім чынам, як толькі цэнтр адкрыўся, мы ўжо выконвалі самыя сучасныя высокатэхналагічныя аперацыі. Аснашчэнне ў нас — згодна з еўрапейскім стандартам. Магутнасць таго ж магнітна-рэзананснага тамографа — 3 тэсла, пры тым што шэраг еўрапейскіх аддзяленняў нейрахірургіі аснашчаны тамографамі магутнасцю 1,5 тэсла, што лічыцца дастатковым.

***— Што ўяўляюць сабой айчынныя навуковыя распрацоўкі? Наўрад ці фінансавыя магчымасці дазваляюць нам вынаходзіць нешта ўнікальнае. Хутчэй, размова ідзе аб спробах удалага імпартазамяшчэння?***

— Кожны год цэнтр распрацоўвае каля 30 навуковых работ, у тым ліку прыкладнога характару. Сапраўды, адна з апошніх ужо добра вядомых імпартазамяшчальных распрацовак звязана з лячэннем злаякасных пухлін галаўнога мозга такім прэпаратам, як цысплацэл, які быў створаны сумесна з вучонымі Інстытута арганічнай хіміі. Шэраг распрацовак звязаны з аднаўленнем функцый пасля захворванняў і хірургічных умяшанняў. Завяршылі, напрыклад, распрацоўку сучасных тытанавых пласцін для пластыкі дэфектаў чэрапа. Разам з РНПЦ траўматалогіі і артапедыі ствараем апорна-рухальны комплекс для фіксавання пазваночніка пасля аператыўных умяшанняў.

***— У цэнтр трапляюць пацыенты, якім патрабуецца экстраннае ўмяшанне? Ці размова ідзе толькі аб планавых аперацыях?***

— Пацыентамі з чэрапна-мазгавымі траўмамі, інсультамі займаецца, напрыклад, шматпрофільная 5-я бальніца. Нашы спецыялісты аказваюць дапамогу нейрахірургічным і неўралагічным аддзяленням па ўсёй краіне — выязджаюць на месцы, кансультуюць. Непасрэдна ў цэнтры лечацца планавыя пацыенты. Аднак ёсць пацыенты з такімі хранічнымі паталогіямі, якія здольны пагоршыць стан хворых у любую хвіліну. Я маю на ўвазе, напрыклад, пухліны галаўнога мозга, анеўрызму сасудаў галаўнога мозга. Гэта вельмі сур'ёзныя захворванні, якія часта патрабуюць экстраннай дапамогі.

Тая ж анеўрызма — змяненне сасудзістай сценкі ў выніку расцягвання ці станчэння — можа не выклікаць ніякіх сімптомаў ажно да самай катастрофы, калі пад уздзеяннем самых розных прычын сасуд ірвецца і кроў выліваецца ў поласць чэрапа. Чалавек мае вялікія шанцы загінуць. Гэта не інсульт, хоць вельмі падобна на яго па праявах.

***— Ці ёсць шанц прадухіліць катастрофу?***

— Бывае, таму, хто скардзіцца на галаўны боль, прапануюць прайсці абследаванне на камп'ютарным тамографе, які дакладна паказвае, дзе размяшчаецца анеўрызма, яе памеры. У такім выпадку праводзіцца спецыяльная аперацыя па «абясшкоджванні» анеўрызмы. Аднак часцей за ўсё спачатку адбываецца кровазліццё, падобнае на гемарагічны інсульт. Толькі прычына сасудзістай катастрофы — не высокі ціск, а разрыў сасуда ў тым месцы, дзе была анеўрызма. На жаль, гэта становіцца прычынай гібелі для некаторых пацыентаў. Астатніх абследуюць, прычым абследаванне на высокатэхналагічным абсталяванні (камп'ютарным тамографе, ангіёграфе) сёння магчымае ва ўсіх абласных бальніцах. Пасля пастаноўкі дыягназу ўсіх пацыентаў, з усёй краіны, накіроўваюць да нас. І ўсім мы рэкамендуем планавае хірургічнае ўмяшанне. Бо ў 90 працэнтах выпадкаў кровазліццё паўтараецца — у бліжэйшыя два-тры тыдні, як правіла, здараецца новы разрыў.

***— Ці можна гаварыць пра рост неўралагічнай паталогіі?***

— Імклівага росту няма. У нас прыкладна такая ж карціна, як і ў шэрагу краін, — хіба ў розных папуляцыях лідзіруюць нейкія «свае» паталогіі. Але ж ніхто пакуль не адмяніў шкодны ўнёсак у захварэльнасць высокай стрэсавай нагрузкі, псіхаэмацыянальных перагрузак і шкодных звычак.

***— І ўсё ж... Можа быць, не толькі дыягностыка, але і само лячэнне зрабіла неверагодны скачок наперад і цяпер пасля аператыўнага ўмяшання можна лёгка ўстаць і пайсці дадому?***

— Сучасная медыцына яшчэ, на жаль, не зусім здольна вось так лёгка, як вы пра гэта кажаце, спраўляцца з вельмі складанымі паталогіямі. А наш цэнтр займаецца якраз такімі станамі. Мы праводзім дыягностыку, лечым, пераводзім на амбулаторнае лячэнне або ў іншыя неўралагічныя ці нейрахірургічныя аддзяленні, пасля чаго яшчэ патрабуецца рэабілітацыя ў адпаведных клініках. Пацыентаў з такімі цяжкімі хваробамі, як неастэнія, рассеяны склероз, мы не вылечваем, але істотна паляпшаем ім якасць жыцця, павялічваем працяглаць іх жыцця. Безумоўна, сучасная хірургія выконвае аперацыі «аднаго дня», з выпіскай на наступны дзень. Аднак гэтая выпіска як мінімум на далейшую рэабілітацыю.

У цэлым у хірургіі ўжо даўно захоўваецца тэндэнцыя малаінвазіўнага, нетраўматычнага ўмяшання. Некалькі гадоў таму мы пачалі ўстанаўліваць у галаўным мозгу нейрастымулятары. Яны хоць і не вылечваюць цалкам, але істотна змяншаюць праявы такой хваробы, як паркінсанізм. Разам з тым, нельга сказаць, што такі метад лячэння паказаны ўсім пацыентам з хваробай Паркінсона.

Да ліку малатраўматычных умяшанняў адносяцца эндаскапічныя аперацыі. Мінімізацыя траўмаў дасягаецца з дапамогай электронных мікраскопаў і эндаскопаў, якія дазваляюць трапіць у спінны мозг або поласць чэрапа, каб выдаліць, напрыклад, аденому гіпофіза. Доступ у поласць чэрапа ажыццяўляецца праз нос або праз невялічкія адтуліны ў чэрапе. Аперацыя ў любым выпадку абсалютна ашчадная. Навыкі такога выдалення любых новаўтварэнняў у галаўным мозгу ў нас добра адпрацаваны. Як, дарэчы, і эндаваскулярныя ўмяшанні, якія прымяняюцца для «выключэння» анеўрызмы. Эндаваскулярны метад дазваляе трапіць у сасуды галаўнога мозга праз сцегнавую артэрыю.

**Выкарыстанне ствалавых клетак дагэтуль застаецца пад вялікім пытаннем. Многія клінікі шэрагу краін нават забаранілі правядзенне падобных даследаванняў. Наша краіна іх працягвае.**

Аперацыі на галаўным мозгу, калі мы ў першую чаргу кажам пра выдаленне пухлін, патрабуюць вельмі высокай дакладнасці. І гэтаму сёння спрыяе нейраманіторынг. Такія спецыялісты, як неўролагі-нейрафізіёлагі, ведаюць, які ўчастак мозга адказвае за рухавасць твару, за маўленне і г.д. Яны дапамагаюць вызначыць межы пухліны, прадбачыць тое, наколькі чалавек захавае пасля праведзенай аперацыі тую ці іншую функцыю. Такім чынам можна прадухіліць інваліднасць, бо няма сэнсу праводзіць аперацыю, якая перавядзе чалавека ў вегетатыўны стан. Можна прапанаваць хвораму іншыя метады лячэння — хіміятэрапію, напрыклад.

***— Можа быць, сітуацыя істотна палепшыцца з укараненнем лячэння ствалавымі клеткамі?***

— Выкарыстанне ствалавых клетак дагэтуль застаецца пад вялікім пытаннем. Многія клінікі шэрагу краін нават забаранілі правядзенне падобных даследаванняў. Наша краіна іх працягвае. Праведзены, напрыклад, навуковыя распрацоўкі па выкарыстанні ствалавых клетак пры лячэнні рассеянага склерозу. Аднак немагчыма пакуль сказаць, што мы атрымалі дакладны эфект, таму не хочацца дарма абнадзейваць пацыентаў. Будучыня лячэння ўсіх захворванняў сапраўды не за хірургіяй, а за геннай інжынерыяй. Калі на клетачным узроўні ўдасца выпраўляць любыя «памылкі», хірургіі давядзецца займацца толькі траўмамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# «ЛЮБЛЮ АСОБАСНАЕ, ГУМАНІСТЫЧНАЕ КІНО»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Шлях незалежнага рэжысёра праходзіць і Шон Бэйкер, які ў гэтым годзе на фестывалі «Лістапад» будзе старшынёй журы конкурсу «Маладосць на маршы». Акрамя яго, у склад журы ўвайшлі фестывальны адборшчык Маркета Хадускова і актрыса Крысціна Флутур. Шон Бэйкер (дарэчы, ён неяк на фестывалі ва Уладзівастоку прызнаўся, што мае рускія карані) пачаў з шоу на тэлебачанні, а прыйшоў да стварэння фільмаў «Прынц Брадвея» і «Старлетка», кожны з якіх атрымаў добрае фестывальнае рэнамэ. У «Старлетцы» дэбютавала 86-гадовая Бясэдка Джонсан і адну з галоўных роляў выканала Дры Хэмінгуэй, праўнучка Эрнэста Хэмінгуэя. Фільм мае ў актыве мноства прэстыжных узнагарод — напрыклад, узнагароду імя Роберта Олтмана амерыканскай кінапрэміі Independent Spirit Awards у Санта-Моніцы, «Акцёрскі прарыў» для Дры Хэмінгуэй на Hamptons International Film Festival, узнагароду Міжнароднай федэрацыі кінапрэсы. На мінулым «Лістападзе» карціна закрывала конкурс «Маладосць на маршы», так што нейкім чынам рэжысёр ужо вядомы мінскаму гледачу. У інтэрв'ю газеце «Звязда» ён расказаў, як усё пачыналася, чаго вартыя доўгія кінапробы і чым рэжысёр можа скарыць Шона Бэйкера як гледача і члена журы.

**— Вы працуеце як з забаўляльнымі тэлепраектамі, так і з аўтарскім кіно; выступаеце як прадзюсар, рэжысёр, сцэнарыст і аператар. Чаму кіно прывабіла вас у свой час у якасці прафесіі.**

— Я хацеў працаваць у кіно, яшчэ калі быў маленькім хлопчыкам. На самой справе гэтаму паспрыяла мая маці, дзякуючы якой я «падвяргаўся» ўздзеянню кіно з самага ранняга ўзросту. Пасталеўшы, я зрабіў некалькі кароткаметражных фільмаў і, у рэшце рэшт, пайшоў вучыцца ў кінашколу Нью-Ёркскага універсітэта. Мне дастаткова пашанцавала, і я атрымаў пэўную камерцыйную работу адразу пасля школы. Гэта стала першым унёскам у асаблівасці маёй працы. Будаваць кар'еру на тэлебачанні я пачаў выпадкова, разам з сябрамі стварыў шоу, якое працавала, што называецца, у «адкрытым доступе». Гэта ў асноўным бясплатнае тэлебачанне, змест якога стварае сама публіка. Праект быў прызнаны тэлеіндустрыяй, і я ведаю, што ён і стаў фінансавай падтрымкай маёй незалежнай кінакар'еры на працягу наступнага дзесяцігоддзя.

**Калі ў фільме ёсць сэрца рэжысёра і бачна, што ён па-сапраўднаму любіць сваю карціну, я магу сказаць, што гэты рэжысёр скарыў мяне.**

**— Якую з ніш (аўтарскае кіно ці тэлепраекты, разлічаныя на масавага гледача) вы займаеце з большым задавальненнем? Кіно для вас толькі праца або ў тым ліку любімая справа?**

— У сэрцы я і вялікі аматар кіно, гэта мая першая сапраўдная любоў. Нават калі я не працую над уласнымі праектамі, гляджу фільмы іншых рэжысёраў. Я вывучаю кіно ўсяго свету столькі, колькі магу. У апошні час я кожны дзень гляджу столькі фільмаў, што, можа быць, ужо і зашмат. Але па меншай меры так я рыхтуюся да таго часу, калі буду членам журы на кінафестывалі ў Мінску. І каб адказаць на ваша пытанне, скажу, што я па-сапраўднаму люблю асобаснае, гуманістычнае кіно. Я знайшоў сябе менавіта ў гэтым.

**— Галівуд вядзе ўпэўненую палітыку па распаўсюджванні свайго прадукту за мяжой, галівудскія кінакарціны пераважаюць у сусветным пракаце. А як адчуваюць сябе незалежныя амерыканскія рэжысёры побач з Галівудам унутры краіны?**

— Стварэнне незалежнага кіно ў ЗША і асабліва тут, у Галівудзе, можа быць даволі складаным. Вы заўважылі, як шмат (значна больш) рэкламы і агалоскі атрымліваюць асноўныя фільмы з ліку мэйнстрыму. І ўсё гэта дзякуючы грошам. Часам гэта вельмі бянтэжыць. Таму што ты зробіш фільм, з якім хацеў бы звярнуцца да вялікай аўдыторыі, але ў цябе няма сродкаў, каб рэкламаваць яго. Я часта атрымліваю лісты ад людзей, якія ўбачылі мае фільмы ўпершыню пасля таго, як яны былі створаны некалькі гадоў таму.



Бясэдка Джонсан і Дры Хэмінгуэй у фільме «Старлетка».

**— Якія складанасці звязаны са стварэннем незалежных ад кінастудый праектаў?**

— Усё зводзіцца да грошай, і, калі ў вас няма да іх доступу, узнікаюць складанасці. У ЗША няма дзяржаўнай падтрымкі мастацтва. Няма латарэйнай сістэмы і няма фінансавання кіно. Таму асноўная цяжкасць заключаецца ў пошуку інвестараў і ў тым, каб утрымаць іх. Калі ваш фільм не прынёс грошай, гэта вельмі непрыемна, бо, хутчэй за ўсё, ваш інвестар не дасць грошай для іншага. Рэжысёр можа мець ідэальны паслужны спіс у плане станоўчых водгукаў крытыкі, але ўсё роўна цяжка знаходзіць грошы для сваіх карцін.

**— Карціна «Прынц Брадвея» падобная на дакументальную дзякуючы манеры аператарскай здымкі, увазе да бытавых дэталяў...**

— Мы выкарыстоўвалі стыль дакудрамы ў здымках карціны «Прынц Брадвея» па многіх прычынах. Асноўная заключаецца ў тым, што дакументальная мова дапамагае аўдыторыі верыць выдумцы. Гэты стыль мы прывыклі бачыць у дакументальных фільмах, рэаліці-шоу і нават хатніх фільмах. Так мы звязваем фільм з рэальнасцю. Так што, калі вы спрабуеце зрабіць фільм у кірунку рэалізму, выкарыстанне гэтага стылю можа быць толькі выгадна.

**У апошні час я кожны дзень гляджу столькі фільмаў, што, можа быць, ужо і зашмат. Але па меншай меры так я рыхтуюся да таго часу, калі буду членам журы на кінафестывалі ў Мінску.**

Акрамя таго, некаторыя з дакументальных метадаў з'явіліся ўжо пры здымках гэтага фільма і дазволілі выкарыстаць некаторыя шчаслівыя здарэнні. Я маю на ўвазе, што мы часам бралі ў фільм годныя характары і сітуацыі, якія адбываліся падчас здымак на нашых вачах.

**— Актрыс на галоўныя ролі ў «Старлетку» вы знайшлі ледзь не ў апошні момант перад пачаткам здымак. Вам складана выбраць акцёраў для сваіх роляў?**

— Мне не складана выбіраць акцёраў, таму што, як толькі сустрэў Дры і Бясэдку, я ведаў, што яны падыходзяць на гэтыя ролі. Што было на самой справе цяжка — знайсці іх. Гэта заняло шмат часу, і мы разглядалі вялікую колькасць іншых актрыс для гэтых роляў. У выніку я не пашкадаваў, што патраціў працу і час на кастынг, таму што атрымаўся, я лічу, ідэальны акцёрскі склад. Так што гэта было сапраўды варта працы, якую мы ўклалі ў фільм.

**— Вашы фільмы (на прыкладзе «Прынца Брадвея» і «Старлеткі») — не проста гісторыі, а сюжэты з пасылам/мараллю. Тут галоўныя героі з катэгорый, у дачыненні да якіх так ці інакш дзейнічаюць стэрэатыпы (эмігранты і порнаактрыса). Вы імкнецеся развянчаць гэтыя стэрэатыпы?**

— Мая мэта больш агульная. Я не спрабую выкрыць стэрэатыпы, але замест гэтага хачу прымусіць аўдыторыю задацца пытаннем. Мае фільмы кажуць, што існуюць універсальныя гісторыі, якія могуць тычыцца любой групы і культуры. Мой апошні фільм, які цяпер у стадыі постпродакшн, пра гурт транссексуалаў-прастытутак. Але фактычная гісторыя не мае нічога агульнага з тым, што яны транссексуалы... і вельмі мала агульнага з тым, што яны прастытуткі. Я стараюся не думаць шмат пра матывы стварэння фільма, таму што адчуваю: гэта зробіць мяне ашчадным. Але пры гэтым вы маеце рацыю, таму што я спрабую проста расказаць гісторыю, у якой кожны змог бы знайсці сябе.

**— Чаму вы пераехалі з Нью-Ёрка, у якім нарадзіліся?**

— Я пераехаў з Нью-Ёрка ў Лос-Анджэлес пасля завяршэння працы над «Старлеткай» у 2011 годзе. Я знаходжу, што ў Лос-Анджэлесе працоўнае асяроддзе для рэжысёра лепшае з многіх прычын. Тут знаходзіцца кінаіндустрыя, да таго ж якасць жыцця вышэйшая. Аднак была і іншая прычына, каб пакінуць Нью-Ёрк: я адчуваў, што шмат у чым гэты горад змяніўся ў горшы бок з-за джэнтрыфікацыі (рэканструкцыя і аднаўленне будынкаў. — **Аўт.**). Я адчуваў, што з культурнага боку Нью-Ёрк ужо пражыў свой лепшы дзень.

**— Чаму вы пагадзіліся стаць членам журы фестывалю ў халодным у параўнанні з сонечнай Каліфорніяй Мінску?**

— Я заўсёды хацеў наведаць Беларусь, аб якой не чуў нічога, акрамя добрага. Праўда, я распешчаны цёплым надвор'ем, але думаю, трохі холаду пойдзе мне на карысць. А калі сур'ёзна, я з нецярпеннем чакаю наведвання прыгожага горада Мінска. Таксама я быў уражаны праграмай фестывалю ў мінулым і з нецярпеннем чакаю прагляду мноства выдатных фільмаў.

**— Чаго вы чакаеце ад фільмаў маладых рэжысёраў як член журы? Чым карціна з конкурсу можа скарыць вас?**

— Я шчыра спадзяюся ўбачыць вялікія работы. Сёння маладыя людзі маюць доступ да тэхнікі, якая можа зрабіць іх фільмы цалкам якаснымі і прафесійнымі. Аднак не мае значэння, наколькі прафесійным выглядае фільм, таму што ў рэчаіснасці ёсць толькі адна характарыстыка фільма, якая мяне ўражвае. Гэта сэрца. Калі ў фільме ёсць сэрца рэжысёра і бачна, што ён па-сапраўднаму любіць сваю карціну, я магу сказаць, што гэты рэжысёр скарыў мяне.

**Калі вы спрабуеце зрабіць фільм у кірунку рэалізму, выкарыстанне стылю дакудрамы можа быць толькі выгадна.**

**— Што такое мастацтва кіно, калі супрацьпастаўляць яго камерцыйнаму, масаваму кіно?**

— Мастацтва ў цэлым рухае намі, натхняе нас, прымушае думаць і паказвае рэчы, якія мы ніколі не бачылі раней, ці бачылі і раней, але ў іншым святле. Калі фільм робіць любую з гэтых рэчаў, то становіцца мастацтвам у маіх вачах. Нават самы камерцыйны масавы фільм можа стаць для мяне мастацтвам дзякуючы гэтаму.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

XXI МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД 2014

## ФІЛЬМЫ, ЗДОЛЬНЫЯ ПАШЫРЫЦЬ СВЯДОМАСЦЬ

### Цэлы тыдзень праглядаў! І нават ноччу

**Такое рознае кіно. З гэтым слоганам кінатэатр «Масква» ўжо заўтра нарэшце адкрые залы і міжнародны кінафестываль «Лістапад». Тое свята, як мы памятаем, якое заўсёды з табой, мной і ўсімі аматарамі кіно, сінефіламі і прафесіянальнымі кінематаграфістамі.**

Мы не чакаем ад «Лістапада» чырвонай дарожкі, актрыс «класа А», эпатажу і пафасу, а толькі добрых, якасных, неадназначных — розных фільмаў. Праграма нам гэта абяцае. Кінатэатры рыхтуюць паказы. Касіры прадаюць квіткі.

У гэтым годзе адкрыццё фестывалю адбудзецца ў «Маскве», на новай для гэтага пляцоўцы, якая дае магчымасць правесці ўрачыстую цырымонію і паказаць фільм адкрыцця ў адным будынку, што значна зручней. Дарэчы, кінатэатр стане месцам толькі для адкрыцця і закрыцця фестывалю, усе фестывальныя паказы размяркуюцца па іншых мінскіх пляцоўках, некаторыя з іх ужо традыцыйныя.

Нагадваю, што адкрываць кінафорум будзе карціна эстонскага рэжысёра Ільмара Раага «Я не вярнуся», да якой «Звязда» неадночы звярталася. Гісторыя, жанр якой сам рэжысёр вызначыў як магічны рэалізм. Дарэчы, метафары сапраўды счытваюцца ў сюжэце на кожным кроку, акрамя таго, што ўся фабула ёсць метафара. Фільм створаны сумеснай вытворчасцю некалькіх краін, сярод якіх і Беларусь у выглядзе нацыянальнай кінастудыі. Абаяльны Ільмар Рааг прыедзе ў Мінск, каб прадставіць свой фільм, значная частка якога якраз здымалася на тэрыторыі Беларусі.

Асноўны конкурс ігравога кіно і «Маладосць на маршы», конкурс дакументальнага кіно і конкурс Нацыянальных кінашкол, «Лістападзік» (у кінатэатры «Піянер») і новы Нацыянальны конкурс — шэсць конкурсаў (выбірайце па гусце і інтарэсах) пачынаюць паказваць свае праграмы з 8 лістапада (не лічачы карціны «Я не вярнуся»). Фільмы конкурсу ігравога кіно і «Маладосці на маршы» шукайце ў кінатэатры «Цэнтральны», дакументальнае кіно і карціны Нацыянальных кінашкол — у «Міры». У кінатэатры «Перамога» з фільма «Белыя росы. Вяртанне» пачнуцца паказы конкурсу Нацыянальнага кіно. У новы конкурс уключаны карціны беларускіх аўтараў, ігравыя, дакументальныя і анімацыйныя, поўнаметражныя і кароткаметражныя — усё, што можа нейкім чынам прадставіць вобраз нашага сучаснага кіно, не важна, стваралася яно ў межах краіны ці не. Старшынёй журы гэтага конкурсу будзе армянскі рэжысёр Аруцюн Хачатран.

Старшынёй журы асноўнага конкурсу ў гэтым годзе будзе вядомы расійскі рэжысёр і прадзюсар Валерый Тадароўскі, «Маладосць на маршы» будзе ацэньваць амерыканскі рэжысёр Шон Бэйкер, журы асноўнага конкурсу дакументальнага кіно будзе ўзначальваць Людміла Саянкова, беларускі кінакрытык, загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі.

Конкурснай праграмай фестываль далёка не абмяжоўваецца. Важна звярнуць увагу на майстар-класы, рэтраспектывы і начныя паказы. Апошняе — таксама навінка кінафестывалю. Тры ночы з пятніцы на суботу і з суботы на нядзелю (7, 8 і 14 лістапада) «Цэнтральны» будзе «круціць» па тры карціны запар. Першая ноч кіно ўжо заўтра.

Праграма «Лістапада» ўключае 163 кінакарціны. Нарэшце мінскі глядач зможа наталіць смагу з добрым кіно на вялікім экране. Свята пачынаецца.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**




# ПРОЦЬМА І ПЛОЙМА — ГЭТА... СЦІЖМА

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь-3» — гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

✓ **Руно** — усходы, пасевы азімых культур. «А вакол так ціха-гожа, а паслухаеш — чутно, як расце трава і збожжа — нівак свежае руно» — пісаў Я. Колас у паэме «Сымон-музыка».

✓ **Свяцёлка** — невялікі, чысты пакойчык. У старажытнасці жылыя памяшканні не мелі вокнаў, акрамя невялікіх адтулін. А свяцёлка, святліца — памяшканне з вокнамі.

✓ **Сціжма** — вялікая колькасць, мноства. Безліч, навала, плойма, процьма, сціжма — усё гэта сінонімы.

✓ **Норт** — круты паварот ракі з хуткім цячэннем.

✓ **Ліхва́** — працэнты з таго, што аддадзена ў пазыку. Ліхвяр — чалавек, які дае грошы ў доўг і бярэ высокія працэнты за іх.

✓ **Летуценне** — мара пра штонебудзь прывабнае.

✓ **За гуж узяцца** — узяцца за справу, лічыць сябе здольным выканаць яе. Па-руску: «слово дать», «груздём назваться».

✓ **Як уюн на гарачай патэльні** — круціцца беспрастанку, не знаходзіць выйсця з цяжкіх абставін, біцца як рыба аб лёд. Рускі аналаг — «крутиться как белка в колесе». Беларускі выраз «як уюн на гарачай патэльні» ўжываецца з абавязковым дзеясловам «круціцца», у якім суіснуюць два значэнні: рухацца, звівацца, і быць у пастаянным клопаце, выкручвацца, нават хітрыцца.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» *кожную суботу ў 11.10—11.25.***

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ■ Тэлесеткі

# ХТО НА НОВЕНЬКІХ?

**У лістападзе гледачоў чакаюць сустрэчы з новымі вядучымі адразу ў некалькіх папулярных праектах тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 3».**

Так, у камандзе «Добрай раніцы, Беларусь!» адбылося адразу і папаўненне, і ператасоўванне добра знаёмых пар. Будзіць краіну па буднях цяпер будуць ажно пяць дуэтаў: Святлана Бароўская і Дзяніс Дудзінскі, Ксенія Дзюкава і Канстанцін Прыдыбайла, Глеб Давыдаў і Вольга Мядзведзева, Вольга Рыжыкава і Яўген Перлін, а таксама Надзея Цімафеева і Сцяпан Гутнікаў. У кампанію да кожнай пары запросяць вядомых у Беларусі асоб з розных сфер, якія на працягу гадзіны будуць адказваць на самыя мудрагелістыя і нязручныя пытанні.

Перамены адбыліся і ў тэлепраекце «Дыя@блог», які выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3». Цяпер праграма будзе выходзіць пяць разоў на тыдзень. Дыялогі «Пра мову» з гледачамі і запрошанымі экспертамі будзе весці прадстаўніца Гомельскага ТРА, вядучая тэлевіктарыны «Размаўляем па-беларуску» Алена Трацэнка, а размовы «Пра вечнае» будуць па чарзе ініцыяваць эканаміст, адзін з кіраўнікоў нацыянальнага праекта спадарожнікавай сувязі і вяшчання «Белінтэрсат» Міхаіл Кірычэнка і кандыдат гістарычных навук, палітолаг Вадзім Ялфімаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

# ПАНЯДЗЕЛАК, 10 ЛІСТАПАДА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**13.55, 15.55 Меладрама «Самазванка».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Камедыя «Гудзонскі ястраб».**



## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.05, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Серыял «Сашка».**
**10.35** Пад грыфам «Вядомыя».
**11.10 Дэтэктыў «Разумнік».**
**13.05 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**15.30** «Comedy Батл. Без межаў».
**17.50, 23.50 Серыял «Таксі».**
**18.50 Серыял «Універ».**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Віртуозы».**
**22.45 Баявік «Кулінар-2».**
**23.45** Хачу ў тэлевізар!
**0.20** «Халі-галі». Скетч-шоу.

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.10** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.45, 19.00, 23.40** «Калейдаскоп».
**8.15, 17.10** «Дыя@блог P.S.».
**8.40 «Дракула Брэма Стокера». Трылер.**
**10.45** «Персона». Віктар Сухарукаў.
**11.05, 19.15** «Размаўляем па-беларуску».
**11.10 «Капітан Соври-голова». Дзіцячы фільм.**
**13.20** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Капітан Соври-голова».
**14.00** «Гісторыя аднаго горада». Дак. фільм.
**14.25** «Камертон». Джазавы гітарыст, народны артыст Расіі Аляксей Кузняцоў.
**14.55 «Казкі старога чараўніка». Камедыя.**
**17.35 «Браты па крыві». Вестэрн.**
**19.20 «Белая гвардыя». Драма. 1-я і 2-я серыі.**
**20.45** «Калыханка».
**21.15** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**22.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.30** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**23.00** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Тарас Юркевіч.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Зеніт» (Расія).
**9.35** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Нафтан» (Наваполацк).
**11.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суёнсі» — «Арсенал».
**13.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сандарленд» — «Эвертан».
**15.10** Тэніс. Турнір ВТА. Выніковы турнір.
**18.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. КПР — «Манчэстэр Сіці».
**20.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**21.10** Час футбола.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.50** Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Дынама» (Мінск).

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Кантуры.
**10.00** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Пётр Сталыпін: стаўка на Вайніловіча».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Трылер «Што хавае хлусня».**
**23.55** «Вячэрні Ургант».
**0.35** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг. Бітва хітоў». Група «Sheldon Cooper» супраць групы «Uncle Bands».
**15.40** «Дарагая перадача».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Дзіўная справа».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Першы паўфінал.
**20.20 Маст. фільм «Малады майстар».**
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30** «Ваенная тайна».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Беларусь сёння».
**9.10 Маст. фільм «Конік».**
**10.45 Маст. фільм «Казус Белі».**
**13.00, 16.00, 19.00, 0.30** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 0.40 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 2.25** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**16.20** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.10 Серыял «Гадзіны кахання».**
**19.20, 3.20 Серыял «Аляксандраўскі сад 2».**
**22.00 Маст. фільм «Выпрабавальны тэрмін».**
**23.40** «Навіны (бягучы радок) культуры».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уладар свету. Нікала Тэсла».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Алергія. Рэквіем па жыцці?».
**16.40** «Касманаўтыка».
**17.15** «Мая планета».
**17.50 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50** Канцэрт, прысвечаны Дню супрацоўніка органаў унутраных спраў Расійскай Федэрацыі.
**22.50, 23.50 Серыял «Пісьмы на шкле».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.20** «Пракурорская праверка».
**9.30, 10.25 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.50** «Суд прысяжных».
**13.30** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.40** «Ядзім дома».
**15.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.45 Серыял «Ляснік».**
**16.00** Сёння.
**16.35 Серыял «Ляснік» (працяг).**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.00** Сёння.
**20.05 Эдуард Флёраў у дэтэктыве «Лягавы-2».**
**22.00** Анатомія дня.
**23.05 Серыял «Дзяржаўная абарона».**
**0.40** «Кастрычнік 1917. Чаму бальшавікі ўзялі ўладу».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 13.10, 19.05, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.20** «Сёння клюе».
**7.50 Камедыя «Каханне з акцэнтам».**
**9.30 Серыял «Міс Марпл».**
**10.20, 16.30** «Кінаблакнот».
**10.30** «Кулінарныя парады».
**10.55 Драма «Джоні Д».**
**13.15 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**15.20, 18.45** «Тэлемагазін».
**16.45 Серыял «Эўрыка».**
**17.30** «Навіны».
**17.40 Серыял «Смерць у раі».**
**19.00** «Тэлепрагноз».
**19.10 Серыял «Грэйсланд».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Гэта як дзень пасярод ночы».**



## ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 19.30** Серыял «Кухня».
**9.30, 13.30, 19.00** Серыял «Адночы ў міліцыі».
**10.00, 20.00** Серыял «Варонiны».
**11.00, 4.30** «Непрыдуманыя гісторыі».
**12.00** Серыял «Метад Лаўровай».
**14.00, 18.45** «Лаві момант».
**14.30, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Прыгоды «Чорнае золата».
**21.10** Меладрама «Лета. Аднакласнікі. Каханне».



**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».
**5.20** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

## КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.05** «Жывая вакцына доктара Чумакова». Дак. фільм.
**12.45** «Мефіста». Маст. фільм.
**15.10** Academia.
**15.55** «Ала Тарасава. Каб іграць на стагоддзі...» Дак. фільм.
**16.35** «Уладары кольца. Гісторыя стварэння сінхрафазатрона». Дак. фільм.
**17.05** Да 90-годдзя з дня нараджэння вялікага музыканта. «Скрыпка Леаніда Когана». Дак. фільм.
**18.15** «Празорца без містыкі. Аскар Акаеў». Дак. фільм.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Сацi. Нясумная класіка...».
**20.10** «Правілы жыцця».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** Да 60-годдзя Юрыя Палякова. «Маналог у 4-х частках». Частка 1-я.
**21.20** Прыступкі цывілізацыі. «Космас — падарожжа ў прасторы і часе». Дак. серыял. 1-я серыя.
**22.05** «Тым часам».
**22.50, 0.05** «Глядзім... Абмяркоўваем...» «Дадзены ўзамен», «Шэсць тыдняў». Дак. фільмы.
**0.40** «Георгій Іваноў. Распад атама». Дак. фільм.
**1.20** Л. Бетховен. Саната № 10.
**2.35** «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Музычны рынг». 2 раўнд. Гурты «Цэнтр» і «Дзіўныя гульні». 1989 год.
**6.50, 20.35, 2.30** Канцэрт замежнай эстрады.
**7.15** Маст. фільм «Куды знік Фаменка?».
**8.30** «Навагодні атракцыён». 1-е аддзяленне. 1984 год.
**10.00** Канцэрт «Рок супраць тэрору». 1-я частка. 1991 год.
**11.00** «Погляд» ад 25 лістапада 1988 года.
**12.00** «Музычны рынг». 3 раўнд. Гурты «Гукі Му» і «А Віа». 1989 год.
**12.55** Маст. фільм «Прыстань на тым беразе».
**14.00** «Пакуль усе дома». 1992 год.
**14.30** «Навагодні атракцыён». 1984 год.
**16.00** Канцэрт «Рок супраць тэрору». 1991 год.
**16.45** Фільм-канцэрт «Сустрэчы з Алай Пугачовай». 1984 год.
**18.00** «...Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**18.50** «Чорны кот». Фільм-канцэрт. 1989 год.
**19.20** «Гэты фантастычны свет». 1980 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**23.00** «Клоўн з восенню ў сэрцы». Фільм-канцэрт. 1986 год.
**0.00** «Музычны рынг». 1 раўнд. Гурты «Ветлівая адмова» і «Джунглі». 1989 год.
**0.50** Фільм-канцэрт «Спявае Дзін Рыд». 1980 год.
**1.30** Тэлеспектакль «Ноч памылак!». 1984 год.
**4.00** «Колба часу».
**5.00** «Погляд» ад 25 лістапада 1988 года.

## EUROSPORT

**10.30** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**12.30. 15.15, 21.45, 2.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**13.00, 14.45, 1.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**17.45** Наймацнейшыя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.
**18.45, 22.45** WATTS.
**19.30, 0.30** Футбол. Еўрагалы.
**20.15** Дартс. Паўночная Ірландыя.
**23.00** Пра рэслінг.
**1.15** Конны спорт. Скачкі.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00, 3.00** Серыял «Сваты 3».
**6.50** Камедыя «Парода бульдог».
**8.25** Камедыя «Помста пушыстых».
**10.55** Камедыя «Вяселле Бэтсі».
**12.25, 17.10, 20.00, 22.00, 0.45** Скетчком «Паміж намі».
**12.45** Камедыя «Зорка сцэны».
**15.30** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».
**18.25** Камедыя «Сутэнёр».
**20.20** Камедыя «Я вельмі ўзбуджаны».
**23.10** Камедыя «Карсіканец».
**1.05** Меладрама «Двое — гэта занадта».
**3.55** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.55, 2.20** «Каханне і пакаранне». Серыял.
**10.05, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.50, 17.55** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.45** «Свая праўда».
**13.40, 3.45** «Аўрора». Серыял.
**14.30** «Жонка. Гісторыя кахання». Клара Новікава.
**15.50, 22.50** «Зорныя гісторыі».
**16.50** «Шчырая размова».
**20.40** «Д'яблы». Серыял.
**21.55, 1.35** «Галоўны калібр». Серыял.
**23.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**0.40** «Часова даступны». Валерый Меладзэ.

## ТБ1000

**6.00, 14.10** Баявік «Чалавек-павук».
**8.05** Меладрама «Салодкі лістапад».
**10.10** Меладрама «Дзённік памяці».
**12.20** Драма «Тысяча акраў».
**16.15** Драма «Тайны знак».
**17.55, 3.55** Драма «Усмешка Моны Лізы».
**20.00** Драма «Вялікія надзеі».
**22.15** Меладрама «Без істэрыкі!».
**0.00** Драма «Паляванне».
**2.00** Фэнтэзі «Віхор».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Жанаты халасцяк».
**8.05** Казка «Рыжык у Залюстроўі».
**10.15** Драма «Гогаль. Найбліжэйшы».
**12.10** Прыгоды «Стрэлы Робін Гуда».
**13.40** Камедыя «Перцы».
**15.25** Камедыя «Апельсінавы сок».
**17.10** Прыгоды «Грэчаскія канікулы».
**18.50** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**20.20** Драма «Агні прытона».
**22.20** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
**0.00** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**2.00** Камедыя «Тры дзяўчыны».
**3.35** Драма «Доўгія праводзіны».
**5.20** Камедыя «Свята Нептуна».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**7.00, 13.00** Гульні розуму.
**7.30, 13.30** Займальная навука.
**8.00** Зрабі або памры.
**8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**9.00, 14.00** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**10.00, 15.00** Хасельхоф супраць Берлінскай сцяны.
**11.00, 19.00** Мегазаводы.
**12.00** Цяжкае золата Аляскі.
**16.00** У пошуках гіганцкага кальмара.
**17.00** Дзікая прырода Расіі.
**18.00, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**20.00** Золата Юкана.
**21.00, 1.00, 4.00** Разета: пасадка на камету.
**22.00, 2.00, 5.00** Камета стагоддзя.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Турэмныя цяжкасці.

## DISCOVERY

**8.00** Залатая ліхаманка.
**8.50** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**9.40** Як гэта ўстроена?
**10.10** Скрозь кратовую нару.
**18.20** Паўстанне машын.
**19.15** Як уладкаваны Сусвет.
**20.10** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**21.05** Свет стваравых клетак.
**22.00** Выжыць разам.
**23.00** Выжыванне без купюр.
**0.00** Голыя і напалоханыя.
**1.00, 4.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.55** Top Gear.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.
**4.55** Хуткія і гучныя.
**5.45** Як гэта зроблена?
**6.10** Звышчалавечая навука.
**7.05** Махінатары.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Тыдзень будзе праходзіць у адзіноце, калі не фізічнай, то эмацыянальнай. І такое становішча спраў будзе для вас самым аптымальным. Не імкнiцеся шукаць кантактаў і сустрэч. Па-першае, малаверагодна, што якія-небудзь зносіны вас парадуюць. Па-другое, вам будзе вельмі карысна падумаць пра сэнс жыцця, пра вечныя каштоўнасці і проста адпачыць ад усіх. Да канца тыдня вы зноў увойдзеце ў звыклы рытм.

**СКАРПІЁН.** Будзьце акуратнымі ў думках і выказваннях, а бліжэй да канца тыдня — і ва ўчынках. Рызыкуеце пераацаніць свае магчымасці ці магчымасці іншых людзей. Будзеце знаходзіцца ў добрым настроі, але гэта можа перашкодзіць у рэалізацыі пастаўленых задач, асабліва калі яны будуць звязаны з іншымі людзьмі. Самыя важныя пачыnanni лепш адкласці на канец тыдня, калі і настрой будзе адпаведным і знешнія абставіны паспрыяюць актыўнай дзейнасці.

**СТРАЛЕЦ.** Вельмі пераменлівы тыдзень. У пэўныя дні вам можа спадарожнічаць поспех, можаце разлічваць на атрыманне фінансавага прыбытку ці іншыя прыемныя падзеі. А ў іншыя ўсё будзе валіцца з рук, сустрэчы зрывацца, а справы складвацца неспрыяльным чынам. Не адчайвайцеся, калі нешта ідзе не так, але і не спадзявайцеся на шчаслівы выпадак, калі вырашылі заняцца важнай справай. На гэтым тыдні наогул не варта да ўсяго ставіцца сур'ёзна, бо ўсё прыходзіць і сыходзіць, усё мяняецца.

**КАЗЯРОГ.** Вельмі ўдалы тыдзень. Ва ўсіх справах і пачынаннях вам будзе спадарожнічаць поспех. Можаце разлічваць на падтрымку калектыву, на сяброў і іншых прыхільнікаў. Вашы ідэі будуць вельмі дарэчы, бо гэта самы спрыяльны час для таго, каб закласці асновы для чагосьці новага. Неўзабаве перад вамі адкрыюцца перспектывы і магчымасці для рэалізацыі сваіх задум і прасоўвання наперад. Адзінае, што ад вас патрабуецца, — гэта не ленавацца і дзейнічаць больш актыўна, чым звычайна.

**ВАДАЛЕЙ.** Трэба быць больш настойлівымі, каб дамагчыся жаданага. Зрэшты, у некаторых выпадках можаце прыбегнуць да невялікіх хітрыкаў, але будзьце асцярожнымі. Калі ўскладаеце надзеі на старонніх людзей, а пры гэтым яшчэ і самі дзейнічаеце не вельмі ахвотна, то існуе высокая верагоднасць таго, што любы працэс будзе зацягнуты. Зрэшты, тыдзень дастаткова спрыяльны, каб можна было не думаць пра нейкія складанасці.

**РЫБЫ.** Вашы дзеянні могуць завесці ў тупік. Спроба ўседзець на двух крэслах, заняцца супрацьлеглымі справамі або атрымаць поспех у розных (а часам і супрацьлеглых сферах) не прывядуць да таго выніку, на які вы разлічвалі. І хоць у першай палове тыдня можаце быць вельмі актыўнымі, усё ж варта больш дакладна вызначаць свае жаданні і дзейнічаць паслядоўна (а ад чагосьці адмовіцца добраахвотна), інакш сітуацыя можа выйсці з-пад кантролю, што прывядзе да краху ўсяго задуманага.

## ЧАЦВЕР, 13 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55 Серыял «Доўгі шлях дадому». Заключная серыя.**
**12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.20 Серыял «Сваты 3».**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.30** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Драма «Зроблена ў СССР». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**23.40** Вечар цяжкага дня.
**1.05** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Серыял «Сашка».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.45, 22.45 Баявік «Кулінар-2».**
**11.50, 21.35 Серыял «Віртуозы».**
**12.50** Кіпень.
**13.30, 18.50 Серыял «Універ».**
**15.45** «Перазагрузка». Мададзёжнае ток-шоу.
**17.50, 23.50 Серыял «Таксі».**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**0.25** «Халі-галі». Скетч-шоу.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.10** «Дабранранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.45, 19.00, 1.25** «Калейдаскоп».
**8.15, 19.15 «Белая гвардыя». Драма.**
**9.45, 17.40** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**10.10 «Саламяны капялюшык». Камедыя.**
**12.15** «Размаўляем па-беларуску».
**12.20, 23.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці акцёра Уладзіміра Кін-Камінскага.
**13.00** «Старажытнае слова. Лёс Міхаіла Баброўскага». Дак. фільм.
**13.30** Д. Смольскі. «Францыск Скарына». Фільм-опера.
**14.40** «Свет прыроды». Лесабалотны комплекс Чырвоны бор.
**15.10** «Вядзьмарка». Кароткаметражны фільм.
**15.40** «Наперад у мінулае».
**16.05** «Блажэн, кто молча был поэт...». Творчасць паэта Веніяміна Блажэннага.
**16.30, 0.15 «Плач перапёлкі». Драма.**
**18.05** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевікторына.
**18.35** «Сіла веры».
**20.45** «Калыханка».
**21.10, 22.45 «Не страляйце ў белых лебедзяў». Драма.**



**22.20** «Дыя@блог». «Пра вечнае».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Рэаліці-шоу «Mix Fight. Новыя гарызонты».
**8.45** Баскетбол. Еўрачэлендж. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Шаўляй» (Літва).
**10.20** Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» (Фінляндыя) — «Дынама» (Мінск, Беларусь).
**12.15** Футбол. Чэмпіянат свету. Чвэрцьфінал. Францыя — Германія.
**14.10** Футбол. Чэмпіянат свету. Чвэрцьфінал. Бразілія — Калумбія.
**16.05** Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Дынама» (Мінск).
**17.55** Авертайм.
**18.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Віцебск» — «Металург» (Жлобін).
**20.45** Тэніс. Турнір ВТА. Выніковы турнір. Паўфінал.
**22.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ліверпуль — Чэлсі.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Зайцаў+1».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Усмешка перасмешніка».**
**23.10** «Ежа, дарога, рок-н-рол».
**0.00 Маст. фільм «Бабёр».**
**1.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 13.50, 20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Першы паўфінал.
**9.05** «Прыгоды дылетанта».
**9.40** «Гарачы лёд».
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.55 Маст. фільм «Хатняя работніца».**
**15.45** «Дарагая перадача».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Нам і не снілася»: «Каварства і каханне».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.20 Маст. фільм «Аблудныя душы».**
**22.10** «Глядзець усім!».
**23.00** «Ганна Чапман і яе мужчыны».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.20** «Вялікія тайны душы».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Дыяспары».
**9.10 Маст. фільм «Мы жылі па суседстве».**
**10.30 Маст. фільм «Блюз ападаючага лісця».**
**12.10** Дак. фільм «У свеце прыгажосці».
**13.00, 16.00, 19.00, 0.30** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 0.40 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 2.25** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**16.20, 23.40** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.10 Серыял «Гадзіны кахання».**
**19.20, 3.20 Серыял «Аляксандраўскі сад 3».**
**22.00 Маст. фільм «Яе сэрца».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Загадкі цывілізацыі. Руская версія». «Таемны код амурскіх абліччаў».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Сталін супраць Берыі. Мінгрэльская справа».
**16.40** «Факты».
**17.15** «Мая планета».
**17.50 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Каменская».**
**21.50 Серыял «Пісьмы на шкле».**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.20** «Пракурорская праверка».
**9.30, 10.25 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.50** «Суд прысяжных».
**13.30** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.40** «Справа густу».
**15.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.40, 16.35 Серыял «Ляснік».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.05 Дэтэктыў «Лягавы-2».**
**22.00** Анатомія дня.
**23.05 Серыял «Дзяржаўная абарона».**
**0.45 Серыял «Наркатрафік».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.20, 19.00, 20.55, 23.40** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** «Мультпарад».
**7.30, 19.10 Серыял «Грэйсланд».**
**9.10, 17.30** «Навіны».
**9.20, 23.30** «Кінаблакнот».
**9.30 Серыял «Міс Марпл».**
**10.30** «TUT.BY прадстаўляе».
**11.00 Баявік «Каардынаты Скайфал».**
**13.25 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**15.20** «Тэлемагазін».
**16.30** «Золата маўчання».
**16.45 Серыял «Эўрыка».**
**17.40 Серыял «Смерць у раі».**
**18.45** «Фэшн is my прафэшн».
**18.55** «Тэлепрагноз».
**19.05 Серыял «Грэйсланд».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Трылер «Фарсаж».**
**23.05 Серыял «Незямны сёрфінг».**

---

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 19.30** Серыял «Кухня».
**9.30, 13.30, 19.00** Серыял «Адночы ў міліцыі».
**10.00, 20.00** Серыял «Варонiны».
**11.00** «Непрыдуманыя гісторыі».
**12.00** Серыял «Метад Лаўрова».
**14.00, 18.30, 5.30** «Лаві момант».
**14.30, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Камедыя «16 жаданняў».



**21.10** Камедыя «Мы — легенды».
**0.00, 5.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Фэнтэзі «Вароты».
**2.30** Драма «Пасля чытання спаліць».
**4.00** «Кіно ў дэталях».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.15** «Джакома Пучыні». Дак. фільм.
**12.20, 20.10** «Правілы жыцця».
**12.50** «Расія, любоў мая!».
**13.15, 21.20** «Космас — падарожжа ў прасторы і часе». Дак. серыял.
**14.05** «Казляня ў малацэ». Маст. фільм.
**15.10** Academia.
**15.55** «Абсалютны слых».
**16.40** «Атамная бомба для рускага цара. Уладзімір Вярнадскі». Дак. фільм.
**17.20** «Непаўторны. Леанід Коган». Дак. фільм.
**18.15** «Віталь Даронін. Улюбёнец публікі». Дак. фільм.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** Да 60-годдзя Юрыя Палякова. «Маналог у 4-х частках».
**22.05** Успамінаючы майстра. «Любімаў. Хронікі». Дак. фільм.
**23.50** «Вяртанне дадому». Маст. фільм.
**1.20** Ян Сібеліус. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока. Сяргей Курэхін».
**7.20** Дак. фільм «Пачынаецца восень».
**7.35, 13.20, 19.35, 2.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**8.00** Тэлеспектакль «Ну, публіка!». 1976 год.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** «Эстрадны вернісаж». 1991 год.
**12.00** «Міжнародная панарама». 1979 год.
**13.00** М/ф «Дом для Кузькі».
**13.45** Тэлеспектакль «Ну, публіка!». 1976 год.
**17.00** «Я вам спяю...». Фільм-канцэрт. 1990 год.
**18.00** «Відавочнае—неверагоднае». Юбілейны выпуск — 15 гадоў. 1988 год.
**19.15** Фільм-балет «Маскоўская фантазія». 1971 год.
**20.00** Тэлеспектакль «Па старонках «Блакітнай кнігі». 1971 год.
**23.00** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Легалізацыя, нашэнне і захоўванне зброі». 1992 год.
**0.00** «...Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**0.50** «Чорны кот». Фільм-канцэрт. 1989 год.
**1.20** «Гэты фантастычны свет». 1980 год.
**5.00** «Клоўн з восенню ў сэрцы». Фільм-канцэрт. 1986 год.

### EUROSPORT

**10.30** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**11.15** Дартс. Паўночная Ірландыя.
**12.00, 15.00, 16.00, 19.00, 2.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**13.00, 1.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**14.45, 17.45** WATTS.
**18.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**19.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**19.30** Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
**19.45** Футбол. Таварыскі матч (U-21). Германія — Нідэрланды.
**22.00** Баявыя майстэрствы.
**0.00** Байцоўскі клуб.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Сваты 3».
**6.55** Камедыя «Сутэнёр».
**8.25** Камедыя «Я вельмі ўзбуджаны».
**10.55** Камедыя «На будоўлю, месье Танер!».
**12.30, 17.20, 20.00, 22.50, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**12.45** Камедыя «Уцёкі».
**15.30** Камедыя «Прыгоды нянькі».
**18.25** Камедыя «Закаханы і бяззбройны».
**20.20** Камедыя «Дзяўчына з карабля».
**23.10** Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».
**1.15** Камедыя «Карсіканец».
**4.00** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 14.30** «Доктар І.».
**8.20, 18.50, 2.05** «Каханне і пакаранне». Серыял.
**9.55, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.45, 17.55** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.40, 16.55** «Шчырая размова».
**13.40** «Аўрора». Серыял.
**15.00, 0.35** «Тайны следства».
**15.55, 22.55, 3.35** «Зорныя гісторыі».
**20.40** «Д'яблы». Серыял. Заключная серыя.
**22.00, 1.20** «Галоўны калібр». Серыял.
**23.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### TV 1000 ТБ1000

**6.10** Драма «Калі я паміра-ла».
**8.10** Меладрама «Нагледзеўшыся дэтэктываў».
**10.10** Меладрама «Прыкінься маім мужам».
**12.10** Фэнтэзі «Залаты Компас».
**14.20** Меладрама «Каханне з паведамленнем».
**16.20** Меладрама «Ходзяць чуткі...».
**18.10** Трагікамедыя «Гуманітарная навукі».
**20.00** Меладрама «Гісторыя пра нас».
**21.50** Меладрама «Добрая дзяўчынка».
**23.30** Драма «Скарб».
**1.30** Драма «Дзікая рака».
**3.40** Драма «Патрыманыя львы».

### РУССКОЕ КИНО TV 1000 ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Казка «»Снягурка»».
**8.10** Казка «Снежная каралева».
**9.40** Камедыя «Апельсінавы сок».
**11.25** Камедыя «Практыкаванні ў выдатным».
**13.10** Казка «Кароль-алень».
**14.35** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**16.35, 4.00** Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
**18.45** Камедыя «Тарыф «Навагодні».
**20.20** Драма «Дзяўчына і смерць».
**22.30** Трылер «Стальны матылёк».
**00.25** Драма «Падарожжа аўтастопам».
**2.00** Драма «Dyxless».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**7.00, 13.00** Гульні розуму.
**7.30, 13.30** Займальная навука.
**8.00** Зрабі або памры.
**8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**9.00, 14.00** Бітва калекцыянераў.
**10.00, 15.00** Скарбашукальнікі.
**11.00, 19.00** Мегазаводы.
**12.00** Старацелі.
**16.00** Невядомае падарожжа Дарвіна.
**17.00** Дзікая прырода Расіі.
**18.00, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**20.00, 22.00, 2.00, 5.00** Золата Юкана.
**21.00, 1.00, 4.00** Дзікі тунец.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**8.00, 10.35** Залатая ліхаманка.
**8.50** Фабрыка ўнікальных аўто.
**9.40, 14.15** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.40, 5.45** Як гэта зроблена?
**11.30, 6.10** Як уладкаваны Сусвет.
**12.25, 17.25** Гаражнае золата.
**13.20, 1.55** Top Gear.
**15.10, 4.55** Аўтадзілеры.
**16.05, 7.05** Махінатары.
**18.20** Дамы на дрэвах.
**23.00** Каралі сталярнай справы.
**0.00** Майстар па стварэнні басейнаў.
**1.00, 4.05** Прапажы на продаж.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.

■ Памяць

# «ШКАДА, ШТО ДА ГЭТАЙ ПАДЗЕІ НЕ ДАЖЫЎ НАШ ДЗЕД...»

## На адкрыццё помніка-бюста генералу-маёру Міхаілу Раманаву ў Магілёў прыехалі яго праўнукі

**Антон і Максім — стрыечныя браты, іх прадзед — легендарны палкаводзец, мужны камандзір той самай 172-й стралковай дывізіі, якая ў гарачым ліпені 1941 года больш за тры тыдні стрымлівала шалёны націск ворага на дняпроўскім рубяжы ля межаў Магілёва.**

— Гэта яшчэ адна добрая падзея ў спісе гарадской праграмы «70 добрых спраў», якая прысвечана 70-годдзю са дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў,— сказаў **старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦУМАРАЎ.** — Гераічная абарона Магілёва — адна з самых яскравых старонак у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. А Міхаіл Раманаў стаў прыкладам самаадданай стойкасці і патрыятызму.

Памяць мужнага генерала ўшанавалі хвілінай маўчання і трохразовым ружэйным салютам. Каля помніка адбылося ўручэнне білетаў новым членам БРСМ і ўрачысты прыём у піянеры.

— Шкада, што ўсяго гэтага не бачыць наш дзед Юрый Міхайлавіч,— з хваляваннем у голасе казаў Антон Сцяпанаў.— Ён вельмі трапятліва ставіўся да ўсяго, што было звязана з яго бацькам, а Магілёў наогул лічыў родным горадам. Ён некалькі разоў прыязджаў сюды і па чарзе прывозіў мяне і Максіма. І па тым, як нас тут прымалі, адчувалася непадробная павага да прадзеда.

Буйніцкае поле пад Магілёвам было яго апошнім полем бітвы. А вось месцам пахавання стала нямецкая зямля. Падчас абарончых баёў Міхаіл Раманаў быў цяжка паранены і трапіў у нямецкі палон. На радзіму ён ужо не вярнуўся. Доўгі час не было вядома, дзе знаходзіцца яго магіла. Сын дасылаў запыты, звяртаўся да архіваў, размаўляў з людзьмі, якія асабіста ведалі Міхаіла Цімафеевіча. Але з месцам і нават датай смерці военачальніка атрымалася блытаніна. Розныя інстанцыі дасылалі ўзаемавыключальную інфармацыю. І толькі пасля асабістага звароту Юрыя Раманава да Гельмута Коля нарэшце ўсё высветлілася. На могілках ваеннапалонных у Хамельбургу магіла генерала значыцца пад нумарам 122, але ж дакладнае месцазнаходжанне яе невядома. У 1991 годзе на спецыяльнай стэле, усталяванай на тэрыторыі могілак, з'явілася мемарыяльная дошка, на якой нанесена і імя Раманава. Ён памёр 3 снежня 1941 года.



**Праўнукі легендарнага генерала Антон Сцяпанаў і Максім Канавалаў каля помніка славутаму прадзеду.**

Антон і Максім, якія жывуць у Кіеве, прывезлі ў Магілёў копію асабістай справы генерала — арыгінал яе ў свой час перадаў Марыі Яфімаўне, жонцы героя, Канстанцін Сіманаў. А яшчэ фотаальбом, у які ўвайшлі пісьмы і архіўныя дакументы...

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара**

■ Захапленні

# МАЛЮЮЧЫ... ГРАШЫМА

## Нумітраксіка — новы від мастацтва?

**Знайсці для сябе хобі ў наш час не так цяжка: колькі цікавых і незвычайных заняткаў для апантаных людзей было прыдумана за гісторыю чалавецтва! Калекцыяніраванне манет, марак, музыкі ці простыя заняткі любімай справай: спортам або, напрыклад, маляваннем — выбірай, што душы заўгодна! А можна пайсці іншым шляхам і прыдумаць хобі самому. Менавіта так зрабіў Юрый МАТУСЕВІЧ, які прыдумаў незвычайны занятак і нават даў яму назву — «нумітраксіка». Карэспандэнты «Звязды» наведаліся да яго ў госці і паразмаўлялі аб гэтым неардынарным хобі.**

— Назваць сябе нумізматам я не магу,— кажа Юрый, перабіраючы стос манет рознага памеру, колеру і формы, якія ляжаць на стале.— Сапраўдныя аматары гэтай справы маюць альбомы, адпаведныя скрыні, у іх ёсць свае патрабаванні да захавання манет. Акрамя таго, яны «палююць» на манеты пэўных гадоў выпуску, рэдкія экзэмпляры. Я ж збіраў манеты, хутчэй, як памяць — прывозіў са шматлікіх вандровак.

Невялікая частка калекцыі Юрыя Матусевіча — гэта ў асноўным манеты памежных з Беларуссю краін: Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы. Аднак трапляюцца і экзэмпляры, радзіма якіх далёка: Аўстралія, Японія, Кітай, Тайланд, Мексіка... Ёсць і грашовыя адзінкі дзяржаў, якіх ужо даўно няма на карце свету,— такіх, як ГДРаўскі пфенінг, югаслаўскі дынар.

— Пачалося ўсё проста: з развалам Савецкага Саюза на руках у мяне апынуліся гэтыя манеты, бо не паспеў размяняць у банку,— смяецца Юрый.— Так яны і стаялі ў скрыні на сваім месцы. А ужо хобі з'явілася выпадкова: гуляў з дзецьмі і перада мной ляжала вось такая ж горка манет, якія я паспрабаваў неяк упарадкаваць. Атрымаўся абстрактны малюнак. Пасля я зрабіў ужо нешта асэнсаванае. Па-мойму, гэта была нейкая кветачка. З гэтага і пачаўся мой новы занятак, якому я даў назву «нумітраксіка».

Нумітраксіка (ад лацінскага nummus — манета і traxerit — маляваць) — гэта стварэнне малюнкаў з манет. Па словах спадара Матусевіча, патрэба ў нейкай назве для хобі ўзнікла, калі займацца маляваннем манетамі пачала і яго дачка. Пасля гэтага стала зразумела, што можна вылучыць розныя тэхнікі складання выяў. Акрамя гэтага, Юрый шчыра прызнаецца, што яму хацелася б пакінуць пасля сябе нешта цікавае, хаця б для сваіх блізкіх. Але ці магчыма ў свеце, у якім, здавалася б, прыдумана ўжо ўсё, зрабіць нешта новае?

— Вядома ж, я цікавіўся, ці існавала нешта падобнае раней. Шукаў інфармацыю ў інтэрнэце, кансультаваўся са знаёмым мастаком, нават рабіў запыт у Нацыянальную бібліятэку — нічога. Самае блізкае да прыдуманага мной — манеты як частка нейкага мастацкага твора, напрыклад, карціны. Увогуле, металічныя грошы выкарыстоўваюцца ў многіх сферах: з іх складаюць вялікія канструкцыі, нават робяць жаночыя ўпрыгажэнні, але інфармацыі аб менавіта маляванні манетамі я не знайшоў нідзе.

Тэхніка стварэння малюнкаў даволі простая. Юрый дэманструе яе тут жа на стале. У якасці асновы выкарыстоўваецца цёмная тканіна. Па такой паверхні манеты не коўзаюцца, а іх бляск на ёй выглядае вельмі прыгожа. «Фарбы» могуць класціся адна на адну, атрымліваецца нешта накшталт рыбінай лускі, а канструкцыя становіцца аб'ёмнай. Можна скласці і звычайны плоскі малюнак. Застаецца толькі правільна падбіраць колер і памер манет, што звычайна нескладана — валюта адной вартасці і з'яўляецца колерам у «палітры».



А вось гатовы малюнак Юрыя пабачыць немагчыма: звычайна твор не застаецца на тканіне доўга. Спадар Матусевіч тлумачыць гэта тым, што адзін малюнак можа хутка надакучыць і лепш пусціць каштоўныя манеты на новую задуму. Старыя ж захоўваюцца ў памяці блізкіх і на фотаздымках — гэта рацыянальна. Цяпер калекцыя такіх фатаграфій даволі вялікая: кветкі, матылькі, анёлкі...

— Вобраз, які я хачу ўвасобіць, з'яўляецца неяк сам сабой, над ім не сяджу і не думаю гадзінамі,— расказвае Юрый Матусевіч.— А вось рэалізацыя



пэўны час займае, да некалькіх гадзін. Тым больш, што манеты — не самы зручны тэхнічны сродак. Бывае, што недзе элемент правальваецца, тады пачынаеш сядзець і пінцэтам вяртаеш усё на сваё месца. Акрамя мяне, нумітраксікай цікавіцца дзве мае дачкі. Жонка інтарэсу не выказвае, але і супраць нічога не мае.

Дарэчы, маляванне манетамі — не адзінае хобі Юрыя. З 2001 года ў інтэрнэце існуе сайт пад назвай «Планета Матусевічаў», стваральнікам якога быў наш герой. У межах сайта больш за 100 сем'яў з 19 краін свету збіраюць інфармацыю аб сваім прозвішчы, дзеляцца ўласнай творчасцю, рэцэптамі страў і нават праводзяць жартаўлівыя конкурсы накшталт «Міс Матусевіч». Таксама пасля семейных падарожжаў Юрый стварае відэаролікі.

— Галоўнае, што на хобі мне хапае часу,— кажа спадар Матусевіч.— Я думаю, што матэрыяльныя патрэбы перашкаджаюць многім людзям выяўляць сябе, і гэта прыкра. У кожнага ёсць свае справы, сваё жыццё. Але трэба вучыцца спалучаць бытавыя пытанні з патрэбай творчасці. На маю думку, гэта вельмі важна.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. Фота Наталлі АСМОЛЫ**

zviazda.by

## WEB-водгук

Самыя цікавыя і надзённыя каментары на нашым сайце

**Мінулы тыдзень выдаўся на сайце zviazda.by даволі плённым на абмеркаванні. Многія матэрыялы не пакінулі чытачоў абыякавымі. На вялікі жаль, абмежаваны аб'ём газетнай паласы не дазваляе даць агляд усіх каментарыяў. Таму мы вырашылі адабраць найбольш цікавыя і актуальныя.**

Пачнём наш агляд з водгукаў на публікацыю **Юрыя Станкевіча «Трутні»,** якая пабачыла свет у нумары за 29 кастрычніка. Нагадаем: пісьменнік у ёй разважаў над праблемай алкаголікаў-лайдакоў. Сярод іншага, прагучала ідэя і аб прымусовым працаўладкаванні.

**@Сяргей:**

*Толку з такіх работнікаў ніколі не будзе. А калі саджаць іх у турму — гэта азначае зноў жа пасадзіць іх на нашу шыю. У вёсках людзі гатовы працаваць. Толькі дзе? Добрых СВК на раён 1–2, а ў астатніх скарочваюць работнікаў, каб астатнім крыху больш заплаціць. Ды ўвогуле не нам з вамі судзіць такіх людзей. Бог іх пашкадуе.*

**@Ікс:**

*Можа, на дапамогу ў такім выпадку прыйдуць лячэбна-працоўныя прафілакторыі?*

▼▼▼

Не пакінуў абыякавымі і блогерскі матэрыял **Ірыны Асташкевіч «Непрыватнае жыццё»,** які быў надрукаваны ў "Звяздзе" тыдзень таму. Напомнім: аўтар у ім расказала пра суседзяў, якія нідзе не працуюць і на працягу ўжо некалькіх гадоў не даюць спакойна жыць астатнім жыхарам шматкватэрнага пад'езда.

**@Ікс:**

*А ўявіце сабе, як выдатна чуваць «канцэрты» ад суседзяў у панэльным доме? У мяне ў самога сусед пастаянна сварыўся з жонкай на п'яной глебе. Дык у маёй кватэры была наладжана амаль штодзённая трансляцыя ўсіх сямейных скандалаў. Ну а калі іх сямнаццацігадовы сын нечакана для сябе зрабіўся татам — о, што было тады... І нішто не дзейнічала, бо з 23 гадзін вечара да 7 раніцы яны не крычалі, адпаведна, выклікаць міліцыю не атрымлівалася. Глушыў іх магнітафонам, бо кожны дзень слухаць гэтую «Санта-Барбару» не было сіл.*

**@Ірына:**

*Адзін са шматлікіх міліцыянераў, які прыходзіў у наш (таксама панэльны) дом, складаць чарговы акт, выказаўся так: добра будзе, толькі калі адзін з іх кагосьці заб'е. Такім чынам, аднаго пахаваюць, другога пасадзяць, трэцяму не будзе з кім сварыцца ў адзіноцтве. Цынічна, але, відаць, ён мае рацыю.*

▼▼▼

Але сапраўдным чэмпіёнам па водгуках сталі прысвечаныя тэме хатніх прыпасаў **«Размовы на кухні» Сяргея Куркача і Уладзіслава Кулецкага,** якія былі надрукаваны ў першы дзень лістапада. Да яе абмеркавання далучыліся і нашы чытачы з Расіі. Больш за тое, у ажыўленую дыскусію былі ўцягнуты і самі аўтары.

**@Юліян**

*Такі мне цікава: хто купляе карнішоны па 21 тысячы за слоік, калі яны па 12–13 прадаюцца? І дарагія шампіньёны па 37, калі ёсць па 18–19 тысяч? У нейкія дарагія крамы вы ходзіце...*

**@Алесь**

*У мяне пытанне да Сяргея Куркача. Дзе ён крэмень шукае і што ён дае тым агуркам? А яшчэ, лепей бы спадар Куркач паведаў аб тым, як чорныя грузды саліць, каб «смаката» праз 50 дзён атрымалася...*

**Уладзіслаў Кулецкі**

*Спадар Юліян, гэтыя цэны былі запісаны ў найбліжэйшай да рэдакцыі краме. Таму дапускаю, што ў іншай маглі быць іншыя цэны. Тым больш бываюць жа дысказунтары з рознымі зніжкамі.*

**@Ікс**

*Ёсць яшчэ адно «але». Камусьці працей гэты лішні мільён (і нават больш) зарабіць за той час, які быў бы змарнаваны на тое, каб самому ў выхадны дзень рабіць закаткі.*

**Сяргей Куркач**

*Спадару Ікс адкажу так. «Казённыя» закаткі і мае прыпасы сур'ёзна адрозніваюцца. Хатнія — робяцца для ўласнай сям'і па ўнікальных рэцэптах з якасных прадуктаў і з добрым настроем. Тут эканомія і грошы не галоўнае...*

*Асабіста я збіраў такія каменькчыкі ў кар'ерах Брэсцкай вобласці. Лепш браць чорны крэмень. Грузды я выключна ў трохлітровым слоіку раблю. Туды зеляніны рознай накласці (кроп, пятрушка і г.д.) і пачакаць мінімум 40–45 дзён для поўнай ферментацыі грыбоў. Тут галоўнае, каб яны не судакраналіся з паветрам і былі ўвесь час у халадзільніку, ці яшчэ дзе-небудзь, там, дзе тэмпература ад 0 да плюс 5 градусаў. А яшчэ грузды трэба класці ў слоік слаямі з соллю. Яе павінна быць каля 3–5% ад вагі грыбоў.*

**@Аляксандр**

*Добра было б падобныя сустрэчы рабіць у відэафармаце! Глядзець заўжды прыцягальна. Відэа перадае настрой удзельнікаў і акцэнты дыскусіі. Прашу прыслухацца!))*

**Уладзіслаў Кулецкі**

*Добра, Аляксандр, пастараемся)))*

**@Чорны воран**

*У грыбы ў межах горада хадзіць можна, нічога тут дрэннага няма. Але выключна ў мэтах азнаямлення з імі. І нават Зялёны Луг — не гарантыя таго, што грыбы будуць чыстыя. Бо не так далёка па прамой лініі ад яго знаходзіцца завод. Плюс дадайце напружаны трафік па МКАД.*

**Сяргей Куркач**

*Цалкам з Вамі згодны. Толькі ў нашага чалавека «хадзіць у грыбы» не азначае азнаямленне. Звычайна пры мэтанакіраваным шпацыры рукі самі цягнуцца зрэзаць гэты грыб. А потым прадаюць бабулькі ля метро... Па мне, дык усе несанкцыянаваныя рынкі — гэта ўвогуле «мінулае стагоддзе»...*

***zviazda.by. Заходзьце, чытайце, каментуйце! Ваша думка важная!***

